НЕ КУПІЦЬ ТАВАР З ПАДМАНАМ 4

НАРАДЖЭННЕ ЭЛІТЫ: УЛАДЗІМІР ПІЧЭТА 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

23 СТУДЗЕНЯ 2019 г. СЕРАДА № 14 (28881)

ЦЫТАТА ДНЯ

Міхаіл РУСЫ, намеснік прэм'ер-міністра:

«Сярэдні заробак у агрmaпрамысловым комплексе Беларусі сёлета павінен перавысіць Br700, але для гэтага неабходна нарошчваць прадукцыйнасць. У любой галіне кадравае пытанне — адно з асноўных. Самае галоўнае — стварыць людзям камфортныя ўмовы працы і жыцця, даць жыллё і належную зарплату. У цэлым па зарплаце сёлета мы выйдзем за Br700, гэта ў сярэднім. Аднак ёсць яшчэ, на жаль, шэраг гаспадарак, напрыклад, у Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай абласцях, дзе ўзровень заработнай платы ніжэйшы. Рашэнне адно — трэба вырабляць прадукцыю. Для фінансавага ж аздараўлення праблемных прадпрыемстваў прымаюцца меры на заканадаўчым узроўні».

Прырода як натхненне

Вядомы на Віцебшчыне мастак і рэзчык па дрэве Іван БУДЗІЧ калісьці стаяў каля вытокаў Лепельскай дзіцячай мастацкай школы. Сёлета гэтай, ужо вядомай, установе — трыццаць гадоў. А Іван Мікалаевіч па-ранейшаму далучае дзяцей да прыгожага, вучыць іх маляваць алоўкамі і пэндзлямі, асвойваць пластыку ў дрэве. А ў вольны час мастак сам любіць выразаць з дрэва скульптуры жывёл і птушак, майстраваць пано, ствараць кампазіцыі — асабліва натхняе яго на творчасць прырода. Цяпер Іван Мікалаевіч у сваёй хатняй майстэрні заканчвае чарговы «прыродны» твор, дакладней цэлую серыю, якая ўпрыгожыць домікі для адпачынку мясцовага лясгаса.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

КАРАТКА

- У Лос-Анджэлесе аб'явілі спіс намінантаў на прэмію «Оскар».

- **Белтэлерадыёкампанія пачынае прыём заявак для ўдзелу ў нацыянальным адборачным туры «Еўрабачання-2019».**
- Выстаўка гістарычнага абутку з музея Кавалера Вінчэнца Андольфі (Італія) адкрылася ў Віцебску.
- **У вёсцы Буйнавічы Лельчыцкага раёна сапёры дасталі са стога сена 100-кілаграмовую авіяцыйную бомбу.**

ISSN 1990 - 763X

ЛЁД СТАНЕ ГАРАЧЫМ

Сёння стартуе адзін з найстарэйшых турніраў Еўропы

111-ы чэмпіянат Еўропы па фігурным катанні пачынаецца на «Мінск-Арэне» жаночымі выступленнямі адзіночак. На працягу двух дзён спартсмены праводзілі афіцыйныя трэніроўкі. Таксама ў панядзелак адбылася тэхнічная нарада менеджараў камандаў і медыцынскай камісіі. СТАР. 3

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Свая справа

КАПІТАЛ З АГАРОДА

Жыхаркі Аршанскага раёна сталі ўдзельніцамі цікавага сацыяльнага праекта

Вёска з цяпліц, лабараторыя па вырошчванні раслін у прабірках, лекцыя па фінансавай адукаванасці, апрацоўка зямлі гектарамі, два ўраджаі за сезон... Гэта і шмат іншага ўбачылі ўдзельніцы сацыяльнага праекта «Прадпрымальная землеўласніца» падчас экскурсій па аграсядзібах і асабістых падсобных гаспадарках Брэсцкай вобласці. На думку арганізатараў праекта, каб упэўніцца, што ў руплівых гаспадароў праца з агароднінай ператвараецца ў стабільны прыбытак, трэба пабачыць гэта на ўласныя вочы. Звяздоўцы таксама далучыліся да гэтага падарожжа.

ЛІЧЫЦЬ СВАЕ ГРОШЫ, А НЕ СУСЕДСКІЯ

Перш чым рушыць у палі ды агароды, адзін з арганізатараў праекта — Маладзёжная сацыяльная служба — зладзіў на базе свайго бізнес-інкубатара ў сталіцы трэнінг па фінансавай адукаванасці. Удзельніцы самі на прыкладзе бюджэту сярэднестатыстычнай вясковай сям'і з Аршанскага раёна падлічылі даходы і расходы і зразумелі, як можна захоўваць сродкі, не выкідваючы іх на вецер.

Разбіўшыся на групы па чатыры чалавекі, будучыя бізнес-лэдзі склалі бюджэт на год і даведаліся, з якіх сродкаў можна стварыць «падушку бяспекі», што падтрымае сям'ю ў непрадбачаных выпадках. А яшчэ трэба ўмець ставіць дасягальныя мэты на кароткі, сярэдні і доўгі тэрміны. І пры планаванні заўжды задаваць сабе пытанне «чаму?», каб высветліць, наколькі нам патрэбная тая мэта і што дасць яе рэалізацыя. СТАР. 5

СТВАРЫЦЬ ЦЭЛАСНУЮ СІСТЭМУ

Матэрыяльнае становішча дзяржслужачага мусіць суадносіцца з якасцю жыцця насельніцтва

Такое меркаванне выказаў беларускі лідар падчас нарады па праекце Закона «Аб дзяржаўнай службе».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што ў сучасных умовах кіраўніцкая дзейнасць патрабуе ад дзяржслужачых высокага прафесіяналізму, адданасці сваёй краіне, строгай выканальніцкай дысцыпліны і ўважлівага стаўлення да людзей. У аснову рашэнняў, якія прымаюцца імі, павінны быць пакладзены сумленнасць і справядлівасць як асноўныя маральныя прынцыпы. Новы закон павінен стварыць выразную аснову для гэтай працы.

Прэзідэнт падкрэсліў: высокі прававы статус дзяржаўных служачых, які забяспечвае прэстыжнасць гэтай прафесіі, немагчымы без устанаўлення ў законе сацыяльна-прававых гарантый для іх. Але гэтыя гарантыі павінны строга суадносіцца з абавязкамі і адказнасцю кожнага супрацоўніка дзяржоргана.

«Пры гэтым, даручаючы распрацаваць гэты закон, я папярэджваў усіх вас, што вось пернікі, якія ў нас прынята раздаваць у любым законе ў выглядзе нейкіх сацыяльных гарантый, не павінны быць вышэй за тое, што яны ёсць, — падкрэсліў ён. — Матэрыяльнае становішча дзяржслужачага павінна расці або падаць у адпаведнасці з ростам або падзеннем жыццёвага ўзроўню нашага насельніцтва — гэта ключавое».

Акрамя таго, адной з прынцыповых пазіцый кіраўніка дзяржавы па законапраекце з'яўляецца замацаванне абавязковых правілаў паводзін, якія забяспечваюць строгую выканальніцкую дысцыпліну.

Нагадаем, Адміністрацыі Прэзідэнта было даручана стварыць рабочую групу з прыцягненнем навукоўцаў і экспертаў, перад якой стаяла задача зрабіць дзяржаўную службу падобнай да вайсковай, выпрацаваць выразныя і вычарпальныя патрабаванні да яе праходжання і тым самым павысіць імідж дзяржаўнага кіравання ў цэлым.

«Як мне дакладваюць, у новым законе выбудавана цэласная сістэма дзяржслужбы. У тым ліку замацоўваюцца сацыяльна-прававыя гарантыі дзяржслужачых, якія адпавядаюць іх абавязкам і максімальна набліжаны да абавязкаў ваеннаслужачых», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы заклікаў прысутных на нарадзе дэталёва выкласці сутнасць кожнай з вынесеных на разгляд прапаноў і адказаць на шэраг прынцыповых пытанняў. Таксама беларускі лідар папрасіў даць агульную характарыстыку этычных патрабаванняў, што прад'яўляюцца да дзяржслужачых, і мер па супрацьдзеянні карупцыі.

«Словам, наколькі вы ўлічылі вопыт нашага жыцця, пачынаючы са старажытных часоў, біблейскіх, і заканчваючы маральным кодэксам будаўніка камунізму. Я мяркую, што вы ўважліва прачыталі пэўныя навелы гэтых і іншых законаў і прыстасавалі, калі гэта падыходзіць, да сучаснасці», — адзначыў Прэзідэнт.

Як паведаміў дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь Вадзім Іпатаў, дадзены праект распрацаваны міжведамаснай рабочай групай, у склад якой увайшлі навукоўцы і эксперты, што пераважна не з'яўляюцца дзяржаўнымі служачымі.

ДА ЯКОГА РАШЭННЯ ПРЫЙШЛІ?

Па выніках канцэптуальнага разгляду новага законапраекта «Аб дзяржаўнай службе» кіраўнік дзяржавы даручыў дапрацаваць гэты дакумент у спакойным рэжыме.

Як расказаў журналістам Вадзім Іпатаў, асноўная навела, якая была вельмі ўважліва абмеркавана на нарадзе ў кіраўніка дзяржавы, — гэта стварэнне цэласнай сістэмы дзяржаўнай службы. «На сённяшні дзень у нас прававое рэгуляванне такое, што разрознена рэгулююцца ваенная служба, служба ў ваенізаваных арганізацыях і дзяржаўная грамадзянская служба. Гэты праект закона мае на ўвазе, што ў краіне існуе адзіная сістэма дзяржаўнай службы, якая аб'ядноўвае ўсе названыя віды. Гэта асноўны канцэптуальны пасыл, які дазволіць выбудаваць далейшае прававое рэгуляванне ўсёй сістэмы дзяржаўнай службы», — сказаў спецыяліст.

Ён таксама выказаўся з нагоды ўзмацнення дысцыпліны і адказнасці дзяржслужачых:

«Для таго каб былі нейкія сацыяльныя гарантыі, так званыя бонусы для дзяржаўных служачых, неабходна паглядзець, як выконваецца службовая дысцыпліна, якая адказнасць у дзяржаўнага служачага перад насельніцтвам краіны. Таму першае, да чаго прыступіла рабочая група, — гэта распрацоўка асноўных напрамкаў, звязаных са службовай дысцыплінай, усталяваннем агульных этычных патрабаванняў».

Яшчэ ўпершыню ў гэтым праекце з'явілася паняцце «службовая дысцыпліна» — падобна да патрабаванняў у воінскіх статутах. Удакладняюцца і этычныя патрабаванні да службовых асоб у службовы і пазаслужбовы час. Дарэчы, там прапісваецца, як дзяржаўнаму служачаму паводзіць сябе ў сацыяльных сетках.

Прарэктар па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях БДУ, доктар юрыдычных навук, прафесар Вольга Чупрыс адзначыла, што падчас нарады Прэзідэнту ў тым ліку было даложана аб шэрагу прапаноў, якія ўзніклі на ўзроўні рабочай групы. Адна з іх датычыцца ратацыйных пасад. Так, у цяперашні час ратацыя прадугледжана ў Беларусі ў дачыненні да двух відаў пасад — гэта пракурорскія і дыпламатычныя работнікі.

«Аднак чаму б пра гэта не казаць у цэлым у сістэме дзяржслужбы для грамадзянскіх дзяржаўных служачых. Кіраўнік дзяржавы сказаў, што, сапраўды, пра гэта трэба падумаць на перспектыву. Замежны вопыт дазваляе нам прааналізаваць ратацыйныя пасады», — дадала яна.

Яшчэ прарэктар выказалася наконт здачы экзаменаў пры паступленні на дзяржслужбу. Паводле яе слоў, магчыма, гэта трэба зрабіць у адзіным органе з выдачай адпаведнага сертыфіката.

«Задача дзяржавы — мець выразную выбудаваную дзяржаўную службу. Але самае галоўнае, што дзяржаўная служба існуе для народа», — падкрэсліла яна.

Адсюль і патрабаванні да дзяржаўных служачых і да самой дзяржаўнай службы — пазіцыі наконт дысцыпліны, узмацнення публічных пачаткаў, аб адказнасці дзяржслужачых. Вольга Чупрыс таксама звярнула ўвагу, што адначасова будзе стаяць пытанне і аб гарантыях дзяржаўным служачым у сувязі з тым, што яны аддаюцца служэнню грамадству. «Таму канчатковая мэта якраз у тым, каб гарманізаваць інтарэсы грамадства, дзяржавы, самі х дзяржаўных служачых», — дадала прарэктар.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

У Індыі мала ведаюць пра Беларусь...

Інакш турысты з гэтай краіны абавязкова б яе высока ацанілі

Такое меркаванне выказала Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Індыя ў Рэспубліцы Беларусь Сангіта БАХАДУР на прэс-канферэнцыі, прысвечанай нацыянальнаму індыйскаму святу — Дню Рэспублікі Індыя. Дзень Рэспублікі Індыя прымеркаваны да 26 студзеня, калі краіна афіцыйна прыняла Канстытуцыю. Сёлета свята супадае з 70-гадовым юбілеем падзеі.

«Таксама гэты год важны для нас, бо з 2 кастрычніка 2018 года цягам двух гадоў мы будзем адзначаць 150-годдзе славутага міратворца Махатмы Гандзі, — паведаміла пасол. — Мы лічым яго бацькам індыйскай незалежнасці. У Мінску ўжо прайшлі тры мерапрыемствы, прысвечаныя гэтай даце. 30 студзеня, у дзень, калі Махатма Гандзі быў забіты, у беларускай сталіцы на вялікіх вулічных экранах з'явіцца невялікі фільм пра яго».

У тэму

Што агульнага ў Ганга і Свіслачы?

Менавіта ў гэтых рэках Інстытут прыродакарыстання НАН Беларусі і аддзяленне акіянаграфіі ўніверсітэта Калькуты праводзілі ацэнку ўздзеяння цяжкіх металаў і поліцыклічных араматычных вуглевадародаў на стан водных экасістэм. Падрабязней пра супрацоўніцтва з Індыяй нам паведамілі ў прэс-службе Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях.

Сярод высокатэхналагічных тавараў, які мы экспартуем у Індыю, найбольшую долю займаюць інтэгральныя і электронныя мікрасхемы, вымяральныя і іншыя прыборы. Таксама высокая доля хімічных рэчываў, як хларыд калію ці поліаміды.

Ды і нашы электробусы даязджаюць да Індыі. У штаце Андхра-Прадэш, як дамовіліся бакі, будзе наладжана вытворчасць электробусаў на базе кузаваў «Белкамунмаш». Прынята рашэнне аб запуску пілотных маршрутаў у горадзе Амаравіці, а таксама магчыма пастаўка некалькіх айчынных электробусаў і зарадных станцый.

Найбольш актыўна ў партнёрстве з Індыяй развіваецца супрацоўніцтва ў фармацэўтыцы.

Надзея АНІСОВІЧ.

Сангіта Бахадур звярнула ўвагу, што беларуска-індыйскія адносіны развіваюцца і застаюцца цёплымі і сяброўскімі ва ўсіх сферах.

За апошнія паўгода адбыліся візіты на высокім узроўні афіцыйных дэлегацый. Гандаль, інвестыцыі і ўзаемныя бізнес-праекты набралі хуткасць. Чакаецца, што аб'ём тавараабароту за мінулы год дасягне 500 мільёнаў долараў, што будзе на 50 тысяч долараў больш, чым пазалетась. «У Індыі зараз імкнуцца адысці ад традыцыйных падыходаў і шукаюць новыя магчымасці для развіцця, і тут Беларусь мае ўсе шанцы аказацца ў сферы інтарэсаў індыйскага бізнесу», — лічыць дыпламат.

Сангіта Бахадур нагадала і пра важныя сумесныя мерапрыемствы ў культурнай сферы — свята, прымеркаванае да Дня Індыі, якое адбылося ў верасні ў Мінску, сабрала больш за 1000 чалавек.

Пасол таксама паведаміла, што ёсць намер пачаць перагаворы пра прамыя авіяпералёты з Мінска ў Дэлі, што, безумоўна, павялічыць паток турыстаў у абедзве краіны.

«Беларусь — гэта адна з найпрыгажэйшых краін, якія я бачыла, і я зараз не спрабую вас падкупіць, — заявіла журналістам Сангіта Бахадур. — Патрэбна больш інфармацыі пра яе. Зараз найлепшы час для беларускіх турыстычных агенцтваў рэкламаваць сваю краіну ў Індыі, бо індыйцы вандруюць паўсюдна, і калі яны пачуюць хаця б адну дзясятую працэнта пра Беларусь, хаця б трошачкі, гэта палепшыць сітуацыю».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Венесуэле прадухілена спроба мяцяжу

Група ваеннаслужачых Нацыянальнай гвардыі Венесуэлы 21 студзеня паспрабавала арганізаваць узброенае выступленне супраць прэзідэнта Нікаласа Мадуры. Спроба бунту правалена, заявіў кіраўнік Нацыянальнага ўстаноўчага сходу Венесуэлы Дыясдада Кабельё, перадае El Comercio. У Каракасе беспарадкі.

Па заявах улад, каля трох гадзін ночы па мясцовым часе 27 нацыянальных гвардзейцаў атакавалі ваенны пост у горадзе Петары і захапілі зброю, якая захоўвалася там. Затым яны адправіліся ў Каракас і выклалі ў інтэрнэт зварот, у якім заклікалі да паўстання. Урадавыя войскі затрымалі гвардзейцаў.

«Невялікая група праціўнікаў, прыпісаных да камандавання зоны нумар 43 Нацыянальнай гвардыі, здрадзіла клятве вернасці радзіме, захапіла зброю пад пагрозай смерці двух чыноўнікаў і двух гвардзейцаў. Да іх будзе ўжыта ўся сіла закона», — гаворыцца ў заяве міністэрства абароны Венесуэлы.

Пасля гэтага ў некалькіх раёнах Каракаса ў падтрымку ваенных, якія спрабавалі падняць мяцеж, пачаліся пратэсты. Жыхары выйшлі на вуліцы і наладзілі барыкады з камянёў і аўтамабільных пакрышак. Падраздзяленні паліцыі і Нацыянальнай гвардыі Венесуэлы пакуль не змаглі ўціхамірыць акцыі пратэсту ў сталіцы краіны, паведаміла на сваім сайце газета El Nacional.

У Афганістане пры атацы талібаў на ваенную базу загінулі 126 чалавек

Баевікі тэрарыстычнай групоўкі «Талібан» напалі на трэніровачны лагер вайскоўцаў у афганскай правінцыі Вардак. Па інфармацыі крыніцы Reuters, у выніку інцыдэнту загінулі 126 супрацоўнікаў базы.

Нападаючыя спачатку ўрэзаліся ў КПП на аўтамабілі, у якім была ўзрыўчатка, а затым — пасля выбуху — адкрылі агонь па ваеннаслужачых. Агнём у адказ яны былі знішчаны.

Атака баевікоў на афганскіх ваенных па колькасці ахвяр стала найбуйнейшай з красавіка 2017 года.

Колькасць турыстычных паездак у свеце дасягнула рэкорднай адзнакі

Колькасць міжнародных паездак турыстаў у 2018 годзе ўзрасла на 6 працэнтаў і дасягнула рэкорднай адзнакі, склаўшы 1,4 млрд. Такую статыстыку прыводзіць Сусветная турысцкая арганізацыя ААН (UNWTO).

У 2010 годзе UNWTO апублікавала доўгатэрміновы прагноз, згодна з якім адзнака 1,4 млрд турыстычных паездак будзе дасягнута да 2020 года. Дасягненне гэтай адзнакі раней за прагноз тлумачыцца ў дакладзе UNWTO значным эканамічным ростам, спрашчэннем візавага рэжыму і больш даступнымі паветранымі перавозкамі.

Колькасць замежных турыстаў у Еўропе летась дасягнула 713 млн, што на 6 працэнтаў больш у параўнанні з 2017 годам. Толькі ў паўночнай частцы Еўропы ў 2018 годзе не назіралася росту турпатоку — з-за няпэўнай сітуацыі з Brexit.

Таксама ў мінулым годзе значна ўзрасла колькасць паездак замежных турыстаў у Афрыку (+7 %) і краіны Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна (+6 %). Краіны Паўднёвай і Паўночнай Амерыкі ў мінулым годзе наведалі 217 млн турыстаў, што на 3 працэнты больш, чым у 2017 годзе. Значны рост турпатоку зафіксаваны ў 2018 годзе на Блізкім Усходзе (+10 % у параўнанні з 2017 годам).

Чакаецца, што ў 2019 годзе з-за стабільных цэн на паліва і даступнасці авіяперавозак турыстычны паток у свеце вырасце яшчэ на 3-4 працэнты.

ФЕСТЫВАЛЬ У РАЎБІЧАХ

Біятлонныя зоркі прыедуць у Беларусь у лютым

«Гонка легендаў» гэтай зімой трэці раз вяртаецца ў Раўбічы разам са старымі знаёмымі і новымі ўдзельнікамі. Арганізатары абяцаюць, што 18 лютага гэтага года фестываль атрымае яшчэ большы размах.

У спартыўным комплексе пад Мінскам аматары спорту змогуць убачыць Дар'ю Домрачаву, Надзею Скардзіна, Алену Зубрылаву, Сімону Хаўсвальд, Корын Ніерге, Ганну Багалій, Флорэнс Баверэль, Алену Пятрову і Кацярыну Дафоўскую. Таксама да нас прыедуць шматразовыя алімпійскія чэмпіёны Уле-Эйнар Б'ёрндален, Рыка Грос, Хальвард Ханевольд, Андрэй Дзярызямля, Венсан Дэфран, Фрода Андэрсан, Сяргей Чэпікаў, П'ер Альберта Карара. І добра знаёмыя беларусам Аляксандр Папоў, Сяргей Новікаў і Аляксей Айдараў.

У праграме фестывалю — мас-старт і змешаная эстафета, але, мабыць, самай галоўнай і кранальнай падзеяй стануць провады з вялікага спорту чатырохразовай алімпійскай чэмпіёнкі Дар'і Домрачавай і алімпійскай чэмпіёнкі Пхёнчхана-2018 Надзеі Скардзіна.

Усе балельшчыкі таксама змогуць трапіць на аўтограф-сесію легендаў біятлона, якая адбудзецца паміж гонкамі.

Як паведамлялася раней, праз два дні пасля «Гонкі легендаў» Раўбічы прымуць чэмпіянат Еўропы. Нядаўна стала вядома, што заяўкі на ўдзел у турніры падалі 34 нацыянальныя федэрацыі біятлона. У спаборніцтвах у Раўбічах прымуць удзел 164 біятланісты і 153 біятланісткі. Для параўнання: у 2004 годзе ў чэмпіянаце Еўропы ў Раўбічах узялі ўдзел 12 краін. За ўсе дні спаборніцтваў спарткомплекс наведалі 75 тысяч гледачоў. Нагадаем, білеты на біятлонныя мерапрыемствы ў лютым ужо паступілі ў продаж.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

ЛЁД СТАНЕ ГАРАЧЫМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Усяго на турніры ў Мінску выступяць больш за 100 атлетаў, Беларусь прадставяць танцавальная пара Ганна Кублікова і Юрый Гуліцкі, а ў мужчынскім адзіночным катанні — Якаў Зянько. Найбольш высокія шанцы на прызавыя месцы ў чатырох відах праграмы — у расійскай

Алімпійская чэмпіёнка Пхёнчхана расіянка Аліна ЗАГІТАВА.

Фота БелТА.

зборнай, за яе выступяць двухразовыя чэмпіёны Еўропы спартыўная пара Яўгенія Тарасава і Уладзімір Марозаў, алімпійская чэмпіёнка Пхёнчхана Аліна Загітава і дзве ўзыходзячыя зоркі расійскай каманды Станіслава Канстанцінава і Соф'я Самадурава. У мужчынскім адзіночным катанні за медалі будуць змагацца Максім Коўтун і бронзавы прызёр чэмпіянату Еўропы 2018 года Міхаіл Каляда.

Пераможцы чэмпіянату Еўропы па фігурным катанні ў Мінску ў адзіночным разрадзе ў мужчын і жанчын атрымаюць узнагароду ў 21 тысячу долараў. Сума прызавых за другое месца складзе 16 тысяч, за бронзу — 11 тысяч. У спартыўным парным катанні і танцах на лёдзе прызавыя медалістам складуць 30 тысяч долараў, 20 тысяч і 12 тысяч.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

Рэйтынг — стабільны

Рэйтынгавае агенцтва Fitch пацвердзіла доўгатэрміновыя і кароткатэрміновыя суверэнныя крэдытныя рэйтынгі Беларусі па абавязацельствах у замежнай і нацыянальнай валюце на ўзроўні «B», прагноз «стабільны». Аб гэтым паведамілі ў Міністэрстве фінансаў.

Агенцтва адзначыла бездакорную аплатную дысцыпліну суверэна, а таксама ўмацаванне макраэканамічнай стабільнасці ў краіне, значны ўклад у якую ўнёс збалансаваны характар макраэканамічнай палітыкі. Агенцтва таксама пацвердзіла рэйтынг еўрааблігацый Беларусі на ўзроўні «B».

(Ул. інф.)

Грашовых заробкаў з-за мяжы стала менш

Нашы работнікі сталі менш дасылаць грошай на радзіму. Грашовыя пераводы беларусам з-за мяжы летась скараціліся на 12,75 % у параўнанні з 2017 годам, паведамляе Нацыянальны банк.

У цэлым за мінулы год гастарбайтары пералічылі на радзіму 326 мільёнаў долараў супраць 373,67 млн долараў годам раней. За мінулы год з Беларусі было адпраўлена грашовых пераводаў на 175 млн долараў. Гэта на 6,3 % больш, чым у 2017 годзе, калі было адпраўлена 164,5 млн долараў. Сярэдняя сума аднаго пераводу ў нашу краіну склала 287,67 долара, з яе — 364,2 долара. Пры падліку ўлічваліся грашовыя пераводы, здзейсненыя праз міжнародныя сістэмы Western Union, «Юністрым», «Залатая карона», Money Gram, BLIZKO, «Лідар», Contact, «Калібры», Faster, Ria Money Transfer.

Пошта на вёсцы пасябравала з дэпазітам

З пачатку года дадзены старт першаму этапу сумеснага праекта Беларусбанка і Белпошты па абслугоўванні жыхароў у сельскай мясцовасці.

На пачатковым этапе ў аддзяленнях паштовай сувязі будуць ажыццяўляцца аперацыі па тэрміновых банкаўскіх укладах у беларускіх рублях. Гэта стала магчыма пасля выкарыстання спецыялістамі пошты цэнтралізаванай аўтаматызаванай банкаўскай сістэмы.

Рэалізацыя праекта дазволіць кліентам афармляць усю лінейку банкаўскіх укладаў Беларусбанка ў беларускіх рублях, адкрываць бягучы (разліковы) банкаўскі рахунак з выкарыстаннем банкаўскай плацежнай карткі і папаўняць яе, афармляць пакет дакументаў і заключаць крэдытныя дагаворы ў падраздзяленнях РУП «Белпошта». Усе этапы праекта завершацца да 1 мая.

Сяргей КУРКАЧ.

Незвычайны госць на Свіслачы

Рэдкі від качкі — нырэц-маранка — заўважаны ў цэнтры сталіцы.

Такая інфармацыя з'явілася на сайце грамадскага аб'яднання «Ахова птушак Бацькаўшчыны». Гэта ўжо другая рэгістрацыя віду ў Мінску. Першы раз яго назіралі тры гады таму, у пачатку студзеня 2016 года.



Нырца-маранку ўжо тыдзень як можна пабачыць сярод качак-крыжанак на незамерзлых участках Свіслачы паміж дамбай Камсамольскага возера і Палацам спорту. Птушка не баіцца людзей, актыўна ныра на дно па малюскаў, умее пастаяць за сябе перад качкамі-крыжанкамі, нягледзячы на свой малы памер. Падобна на тое, што яна вырашыла тут затрымацца.

Арнітолагі тлумачаць, што гэты від гняздуецца ў тундры. Большую частку свайго жыцця птушка праводзіць у моры. Яна нават больш ныра, чым плавае, бо здабывае сабе водных жучкоў, малюскаў, іншых беспазваночных недзе на дне, пад вадой. Гэтая качка рэдкая не толькі для Беларусі. Нырэц-маранка занесены ў Міжнародны чырвоны спіс як уразлівы від — колькасць птушак імкліва скарачаецца.

Нагадаем, што ў студзені грамадскае аб'яднанне «Ахова птушак Бацькаўшчыны» і Навукова-практычны цэнтр па біярэсурсах Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі праводзяць штогадовы зімовы ўлік вадаплаўных птушак **для таго, каб ацаніць, колькі птушак і якіх відаў зімуюць у Беларусі, і спланаваць дзеянні па іх захаванні.**

Надзея НІКАЛАЕВА.

Небяспечны веласіпед

У вёсцы пад Гроднам аўтамабіль пераехаў веласіпедыста, які ляжаў на дарозе.

Аварыя адбылася 20 студзеня ў вёсцы Табала Гродзенскага раёна. Аўтамабіль «Рэно», за рулём якога знаходзіўся 30-гадовы жыхар Гродзенскага раёна, здзейсніў наезд на 44-гадовага мужчыну, які ляжаў на дарозе. Ад атрыманых траўмаў той памёр на месцы.

Па словах **намесніка начальніка Гродзенскага РАУС Валерыя ШАМРУКА,** пацярпелы ехаў на веласіпедзе. Як і калі ён упаў з яго, пакуль невядома. Ніхто з мясцовых жыхароў гэтага не бачыў. Наезд на веласіпедыста адбыўся каля 19 гадзін вечара. Ці быў ён у нецвярозым стане, таксама пакуль невядома. Ёсць інфармацыя, што пацярпелы неаднаразова прыцягваўся да адказнасці за парушэнне правілаў дарожнага руху як пешаход.

Валерый Шамрук зазначыў, што апошнім часам павялічылася колькасць аварый з удзелам веласіпедыстаў. Толькі ў Гродзенскім раёне рэгіструецца ад трох да васьмі парушэнняў. А між тым для гэтага транспарту таксама ёсць шэраг абмежаванняў. Нельга карыстацца веласіпедам ва ўмовах снегападу і галалёдзіцы. А гэтымі днямі якраз і назіралася такое надвор'е. Таксама існуюць пэўныя патрабаванні да стану самога сродку. Калі раней на веласіпедах былі простыя святлоадбівальныя катафоты, то зараз павінны быць ліхтары, якія свецяць пастаянна, спераду — белым святлом, а ззаду — чырвоным.

Што датычыцца данай аварыі, веласіпедыст меў на адзенні святлоадбівальныя элементы, але невядома, ці мог кіроўца своечасова іх заўважыць, калі той ляжаў на дарозе. Заведзена крымінальная справа.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Свята скончылася панажоўшчынай

Вяселле ў Віцебску скончылася рэанімацыяй для айчыма нявесты, яго нажом параніў наваспечаны сваяк.

Па інфармацыі УУС Віцебскага аблвыканкама, інцыдэнт адбыўся ўначы. Айчым і маці нявесты прыехалі на вяселле з Брэсцкай вобласці. Пасля заканчэння ўрачыстасці сваякі маладых паехалі на здымную кватэру, дзе працягнулі гулянні. У нейкі момант бацька жаніха ўстаў і ўдарыў нажом у шыю айчыма нявесты. Мужчыну даставілі ў рэанімацыю, ён жывы. Параніўшы сваяка, наваспечаны свёкар растлумачыць прычыны ўдару не змог.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПЕРШЫ ЗІМОВЫ

Фатаграфаванне і вызначэнне птушак на час, або адным словам — фотабёрдынг, набірае ў Беларусі папулярнасць. Пад эгідай ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ) ужо праведзена восем чэмпіянатаў, якія праходзілі як у сталіцы, так і ў двух абласных цэнтрах — Брэсце і Гомелі. Цяпер жа, 26 студзеня, стартуе першы зімовы чэмпіянат па фотабёрдынгу, які носіць пакуль эксперыментальны характар па фармаце правядзення.

Па-першае, месца правядзення — любое, гэта значыць кожны выбірае яго сам. Ведаеш, дзе больш за ўсё птушак зімой, едзь туды і фатаграфуй на здароўе. Па-другое, ужо можна карыстацца любым відам транспарту. Гэта, дарэчы, і з пункту гледжання ўмоў надвор'я вельмі правільна. Замерз — сеў у аўтобус ці маршрутку, праехаў да наступнага «птушынага» пункта, заадно і сагрэўся.

Птушак зімой у Беларусі, вядома, паменш будзе, чым у астатнія поры года (і істотна, прыкладна ў два разы), затое менавіта ў зімовы час на тэрыторыі нашай краіны з'яўляюцца віды птушак, якіх не ўбачыш гарачым летам. Акрамя знаёмых многім гілёў і амялушак, «пагрэцца» да нас прылятаюць звычайная і попельная чачоткі, сняжуркі (пуначкі), рагатыя жаваранкі і інш. Рагатых жаўрукоў я якраз і сустрэў гэтым студзенем у вёсцы Даўгалессе Гомельскага раёна. Там жа і планую прымаць удзел у чэмпіянаце па зімовым фотабёрдынгу. Дарэчы, удзел бясплатны, і любы ахвотны можа падаць заяўку да **17.00 25 студзеня.** Спяшайцеся! Больш падрабязна пра акцыю па спасылцы **http://ptushki.org/news/656030.html.**

Птушкі чакаюць удалых здымкаў!

Максім ШАСТАКОЎ,
член савета Гомельскага рэгіянальнага аддзялення АПБ.

Анталогія ашуканства

І старому, і малому можа трапіцца няякасны тавар

З народнай мудрасцю «век жыві, век вучыся» не паспрачаешся. Вось вы, напрыклад, ведаеце, якія святлодыёдныя лямпачкі не адпавядаюць тэхнічным рэгламентам па бяспецы? А чым небяспечныя ледзянцы «Карамелькі» расійскай вытворчасці? І нават не ў курсе, што не так у дзіцячым адзенні турэцкага вытворцы? Усе гэтыя тавары можна знайсці ў нашых крамах і на рынках, папярэджваюць супрацоўнікі Магілёўскай інспекцыі Дзяржстандарта. І гатовы навучыць спажыўцоў быць больш разборлівымі пры іх выбары. Нашы суразмоўцы — намеснік начальніка інспекцыі Наталля ЖУКАВА і начальнік аддзела дзяржнагляду за выкананнем патрабаванняў тэхнічных рэгламентаў і стандартаў Алег БУРАКОЎ.

«Шпаргалка» для пакупніка

Каб азнаёміцца з поўным спісам небяспечнай прадукцыі, дастаткова зайсці на сайт Дзяржаўнага камітэта стандартызацыі Рэспублікі Беларусь. Там размешчаны рэестр з пералікам тавараў, забароненых да ўвозу і (або) абарачэння на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Гэта абагульнены спіс усяго таго няякаснага, што выяўляюць інспекцыі ў маштабах краіны. Такая «шпаргалка» для пакупніка з'явілася ў інтэрнэце тры гады таму. Але супрацоўнікі з кожным разам знаходзяць нешта новае і нестандартнае.

— Для нас галоўнае — прадухіленне парушэнняў патрабаванняў заканадаўства Мытнага саюза, нацыянальнага заканадаўства, тэхнічных прававых нарматыўных актаў і стандартаў, а таксама патрабаванняў заканадаўства ў галіне стандартызацыі і метралагічнага нагляду або, калі казаць простымі словамі, абарона ўнутранага рынку ад небяспечнай прадукцыі, — гаворыць Наталля Жукава. — Летась наша інспекцыя правярала на прадмет адпаведнасці нормам прадукцыю харчовай і лёгкай прамысловасці, тавары для дзяцей і імпартную электратэхніку. Было выяўлена шмат чаго небяспечнага.

Сырок з падманам

У гандлёвай сетцы Магілёва знайшлася няякасная малочная прадукцыя расійскай вытворчасці, дзе адзначаліся парушэнні па цэлым шэрагу мікрабіялагічных паказчыкаў. Такіх, як наяўнасць недапушчальнай колькасці бактэрый кішэчнай палачкі, перавышэнне дражджэй і цвілі (у некаторых выпадках аж у 51 раз), заніжанае ўтрыманне малочнага тлушчу.

— Асабліва грашылі гэтым салодкія сыркі маскоўскіх таварыстваў з абмежаванай адказнасцю «Планета сыркоў» і ТАА «Сыркофф», — удакладняе Наталля Жукава.

У чорны спіс трапіла і расійская «Згушчонка з цукрам». Масавая доля малочнага тлушчу ў ёй склала 8,6 %, у той час як у маркіроўцы было заяўлена 50. Верагодна, што малочны тлушч замянілі нейкім раслінным.

А вось зусім свежыя прыклады. Магілёўскія спецыялісты звярнулі ўвагу на недабраякасныя ледзянцовыя цукеркі пад назвай «Карамелька» са смакам ліманаду, дзюшэсу, барбарысу і яблыка расійскага вытворцы ТАА «Паўднёвая зорка». Перавышэнне максімальнага ўзроўню сінтэтычных фарбавальнікаў у іх складала дзесьці паўтара раза. Пры гэтым інфармацыі, што прадукт утрымлівае фарбавальнікі, на маркіроўцы не знайшлося. Як і звестак пра тое, што гэтыя фарбавальнікі аказваюць уплыў на актыўнасць і ўвагу дзяцей.

Не задаволілі спецыялістаў і ўкраінскія напаўняльнікі вытворчасці ТАА «Шафран Эліт». Там таксама былі пагражальныя для дзіцячай увагі і актыўнасці фарбавальнікі.

Спажывец, будзь пільны

— Нягледзячы на рэгулярныя наглядныя мерапрыемствы, парушэнняў менш не становіцца, — сведчыць Наталля Жукава. — І гэта пры тым, што прымаюцца меры па забароне продажу няякаснага тавару. Інфармацыя пра вынікі нашай работы размяшчаецца на нашым сайце moig.by. Праводзім паўторныя мерапрыемствы, каб упэўніцца, што няякасны тавар зняты з продажу і падобных парушэнняў няма. За невыкананне нашых прадпісанняў прадугледжваецца адміністрацыйная адказнасць. Звесткі аб выяўленні небяспечнай прадукцыі перадаюцца ў Дзяржстандарт, дзе прымаюцца рашэнні аб забароне ўвозу яе на тэрыторыю Беларусі. Інфармацыя аб прадукцыі, якая не адпавядае нормам, накіроўваецца і ў іншыя наглядныя органы краіны.

— Мы таксама адсочваем, куды паступае забаронены для продажу тавар. Рэалізатары павінны яго альбо знішчыць, альбо вярнуць пастаўшчыкам, — дадае Алег Буракоў. — Пры праверках і маніторынгах мы пастаянна нагадваем гандлёвым суб'ектам пра рэестр, які павінен выконвацца. Але забароненыя тавары ўсё роўна трапляюць у гандлёвую сетку. І такая сістэма па ўсіх пазіцыях, якія мы правяралі. Рэестр — добрая памятка для насельніцтва таго, што не трэба купляць. Ім карыстаюцца і іншыя наглядныя органы, якія ажыццяўляюць нагляд спажывецкага рынку. Усе парушэнні пацверджаны выпрабаваннямі ў акрэдытаваных лабараторыях. Прадукцыя, якая не адпавядае патрабаванням, лічыцца небяспечнай для спажывання.

Нестандартная распашонка

Асабліва трэба быць пільнымі пры выбары тавараў для немаўлят. Спецыялісты прыводзяць прыклады, калі нядобрасумленныя гандляры не грэбуюць тым, каб зарабіць грошы нават на здароўі самых маленькіх.

— Найбольш распаўсюджаныя парушэнні — гэта адкрытая пятачная частка ў абутку для дзяцей ясельнага ўзросту, перавышэнне дапушчальнай вышыні абцаса, неадпаведнасць паказчыкам па гіграскапічнасці і паветрапранікальнасці ў прадметах адзення або абутку, — пералічвае Наталля Жукава. — Тыя ж вусцілкі ў дзіцячым абутку павінны быць зроблены з матэрыялаў па максімуме натуральных, сінтэтыкі там павінна быць не болей чым на 20 %. А нашы праверкі паказваюць, што выкарыстоўваецца 100-працэнтная сінтэтыка. Шмат парушэнняў па маркіроўцы, адсутнічае поўная інфармацыя для спажыўца. Не рэдкасць, калі нам не могуць прад'явіць дакументы аб ацэнцы адпаведнасці.

— Пры праверцы дзіцячага адзення мы выяўлялі распашонкі для нованароджаных са швамі ўнутр, — дадае Алег Буракоў. — Гэта вельмі грубае парушэнне. Швы павінны быць звонку, каб не намульвалі дзіцяці. Невыкананнем гэтых патрабаванняў грашылі Расія і Кітай. Прыходзілася таксама выяўляць кітайскія бразготкі для дзяцей, якія былі размаляваны зверху. Дзіця цягне ўсё ў рот, і такія цацкі вельмі небяспечныя.

Суразмоўцы звяртаюць увагу на тое, што ўся прадукцыя, якая аказалася няякаснай, як правіла, недарагая. Гэта адна з красамоўных прыкмет, якая павінна насцярожыць спажыўца.

На заметку

Усе ведаюць, што вельмі распаўсюджаны спосаб падмануць пакупніка — гэта «падрэгуляваць» вагі. Але што павінна насцярожыць? Супрацоўнікі магілёўскай інспекцыі Дзяржстандарта распрацавалі карысную памятку. У ёй гаворыцца, што вагі павінны правярацца адзін раз у год і знак паверкі (галаграфічнае кляймо) трэба шукаць на пярэдняй панэлі вагаў. Павінна насцярожыць, калі пад ножкі вагаў падкладзены кардон або іншыя прадметы. Трэба, каб вагі стаялі на паверхні роўна без розных там прылад. Парушэннем лічыцца таксама, калі продаж вядзецца на вагах, не абароненых ад уздзеяння ветру, дажджу або снегу. Гэтыя і іншыя парады можна знайсці на сайце інспекцыі. Тут жа шмат карыснай інфармацыі пра забароненыя тавары. Усё гэта абавязкова дапаможа вам пазбегнуць непрыемных здзелак і захаваць сабе не толькі нервы, але і настрой.

Ліхтарыкі з сюрпрызам

Памятаеце рэзанансны выпадак, калі ў аднаго беларуса загарэліся ў кішэні бесправадныя навушнікі? Гэта яўна быў «левы» тавар, які адбракоўвае Дзяржнагляд. Як паказвае практыка, праверку на якасць не праходзяць некаторыя маркі мабільных тэлефонаў, фенаў, гірляндаў, школьных заплечнікаў, нават мэблі. У Магілёве спецыялісты знаходзілі ў рэалізацыі забароненыя для продажу падаўжальнікі, святлодыёдныя свяцільнікі, акумулятарныя ліхтарыкі.

У спіс няякасных трапілі свяцільнікі расійскіх гандлёвых марак «Эра» і «Надзея», кітайскіх Diamond і TDM Electric, а таксама ITALMAC і Shefort. Не прайшла лабараторныя выпрабаванні расійская электрычная плітка «Эльбрус», электрашчыпцы турэцкай вытворчасці для завіўкі валасоў «Sinbo» і кітайскай — «Energy», кітайскія паяльнікі «Wester» і расійскія запальніцы «ЭЗ-2», іншая электратэхнічная прадукцыя. Павялічылася ў продажы колькасць забароненай шклоабмывальнай вадкасці для аўто.

— Асабліва трэба быць пільнымі там, дзе справа датычыцца складанай электратэхнічнай прадукцыі, — дае параду Алег Буракоў. — Такі тавар лепей набываць у спецыялізаваных крамах. Там ва ўсялякім выпадку наладжаны кантроль. Прадукцыя ўвозіцца на тэрыторыю Беларусі ў вялікай колькасці і пастаўшчык зацікаўлены ў супрацоўніцтве з надзейнымі партнёрамі.

— А з заяўкамі ад насельніцтва вы працуеце? — цікаўлюся напаследак.

— Мы разглядаем усю інфармацыю, якая паступае ад магіляўчан, — кажа Алег Буракоў. — Але сігналаў наконт няякаснай і небяспечнай прадукцыі вельмі мала. Хацелася б, каб спажыўцы былі больш актыўнымі. Заклікаем быць уважлівымі і паведамляць пра той тавар, які выклікае сумненне.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Майце на ўвазе

«НЕЗАМЯРЗАЙКА» БЕЗ ПРАБЛЕМ

З надыходам устойлівых маразоў для аўтаўладальнікаў паўстае адна з надзённых задач — своечасова «ўзброіцца» праверанай і эфектыўнай вадкасцю для абмывання шкла ў халады, якую ў народзе называюць «незамярзайкай».

Большасць такіх вадкасцяў вырабляюць з растворaў спіртоў з вадой з дабаўленнем мыйных сродкаў, араматызатараў, фарбавальнікаў. У сучасных шклоабмывальных вадкасцях выкарыстоўваюць ізапрапілавы спірт, прапіленгліколь, этыленгліколі. Ізапрапілавы спірт дазволены да выкарыстання пры вытворчасці шклоабмывальных вадкасцяў.

А вось нелегальныя вытворцы выкарыстоўваюць для вырабу шклоабмывальнікаў метылавы спірт (метанол), адзначылі ў Рэспубліканскім цэнтры гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя. Метылавы спірт мае слабы пах, яго не адрозніць ад этылавага (харчовага) спірту, ён танны і добра чысціць шкло. Пры гэтым варта ведаць, што метанол — моцная кумулятыўная атрута, якая валодае накіраваным дзеянням на нервовую і сасудзістую сістэмы, зрокавыя нервы, сятчатку вока. Метылавы спірт можа выклікаць вострыя атручэнні са смяротным зыходам пры інгаляцыі, абсорбцыі праз непашкоджаную скуру, заглынанні; раздражняе слізістыя абалонкі верхніх дыхальных шляхоў, вачэй. Паўторнае доўгае ўздзеянне метанолу выклікае галавакружэнне, болі ў вобласці сэрца і печані, прыводзіць да неўрастэніі, пагаршэння зроку, захворванняў органаў страўнікава-кішачнага тракта, верхніх дыхальных шляхоў, дэрматыту.

У адпаведнасці са спецыяльнай пастановай Міністэрства аховы здароўя вызначана абмежаванне колькасці метанолу ў нізказамярзальных шклоабмывальных вадкасцях у канцэнтрацыі не больш за 0,05 аб'ёмнага працэнта. Устаноўлена, што ў шэрагу выпадкаў гэтае абмежаванне не было выканана. Таму ў Беларусі забаронены абарот асобных шклоабмывальных вадкасцяў расійскай вытворчасці. Гэта датычыцца «ICE DRIVE -30» (ТАА «ІВЕНТА»), «FrozOK -30» (ТАА «Аўта-Хімічная кампанія»), «Clean Way -30» — (ТАА «ІВІЁН»), «GOLD STAR «Gleid Expert» -30» (ТАА «КлінГлас»), «MASTER ICE -30» (ТАА «Нортвуд»), «NORD ACTIV -30» (ТАА «ПаралельЛімітэд»), «Патрыёт -30 °С» (ТАА «Альянс»).

Як выбраць надзейную і бяспечную шклоабмывальную вадкасць для аўто?

Спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя падкрэсліваюць, што вадкасць трэба набываць толькі ва ўстаноўленых месцах гандлю. Пры набыцці варта звярнуць увагу на інфармацыю на спажывецкай тары, вынесеную на этыкетку. Яна павінна змяшчаць звесткі аб вытворцы з указаннем адраса, тут павінна быць пазначана назва прадукцыі, яе прызначэнне, склад, адпаведнасць тэхнічным умовам, па якіх прадукцыя вырабляна, тэрміны прыдатнасці, меры засцярогі. Тады «незамярзайка» насамрэч будзе без праблем, і для здароўя ў тым ліку.

(Ул. інф.)

КАПІТАЛ З АГАРОДА

«Як узяўся за гуж, не кажы, што спіна баліць», — раіць патэнцыйным бізнеслэдзі Сяргей СЕНЬ, прадпрымальнік з вёскі Белавуша.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Здавалася б, элементарныя рэчы, аднак заняткі атрымаліся захапляльныя. «Сем'і» яшчэ доўга пасля абмяркоўвалі бюджэт...

— Праект ствараўся для жанчын, якія хацелі б паспрабаваць дадатковы заробак для сябе і сям'і або сёння не маюць працы і хацелі б стаць самазанятымі ў сельскай гаспадарцы. Ім пакажуць, якія магчымасці ёсць для развіцця прадпрымальніцтва і які вопыт яны могуць перанесці ў свой раён. Пасля яны змогуць перадаць іншым, што пабачылі, падзяліцца сваім досведам, расказаць, што ўмеюць, — лічыць **Юлія КАПЦЭВІЧ, каардынатар праектаў Беларускага дзіцячага фонду,** без якога, па сутнасці, праект «Прадпрымальная землеўласніца» не адбыўся б.

На працягу ўсяго сезона — ад моманту вырошчвання расады да збору і рэалізацыі ўраджаю — прадпрымальніц будуць суправаджаць эксперты, якія падкажуць, як рабіць найлепш. У ліку іншых і **Настасся ЛЫСЕНКА, дырэктар цэнтра падтрымкі прадпрымальніцтва (бізнес-інкубатара) у горадзе Барань,** што ў Аршанскім раёне:

— Каб праект спрацаваў, трэба, каб людзі, якія пачнуць сваю справу, жылі недалёка адзін ад аднаго. Гэта і лагістыка — каб фура з мінімальнымі затратамі прыехала і забрала вырашчаную прадукцыю. Паралельна мы плануем стварыць цэх па перапрацоўцы прадукцыі. Закупіцца сушылкамі, маразілкамі і, магчыма, стварыць лінію па кансервацыі тавару. Гэта будзе нешта накшталт сельскага бізнес-інкубатара, дзе можна перарабіць сваю прадукцыю самастойна або даручыць гэта спецыялістам.

ЦЯПЛІЦА НА «ВЯСЕЛЬНЫЯ» ГРОШЫ

На другі дзень патэнцыйныя аграбізнесвумен рушылі знаёміцца з вопытнымі агароднікамі Столінскага раёна. Праязджаючы праз агурковую сталіцу Беларусі — вёску Альшаны, не пераставалі дзівіцца, што ўся яна стаіць на цяпліцах. Здаецца, і дамоў за імі не відаць.

— Гэта ўжо цэлыя вёскі, калгас на ўчастку, — тлумачыць **Рыма ЕПУР, выканаўчы дырэктар праекта.** — У іх агульныя сховішчы для прадукцыі, куды можа ўехаць фура. Гэта робіць вытворчасць больш таннай, як і ацяпленне цяпліц дровамі, хаця тут ёсць газ. Чым больш жанчын скааперуюць свае намаганні, тым больш шанцаў, што гэты сацыяльны праект стане бізнесам.

Сапраўды, каля кожнага дома навалены бярвёны — вёска рыхтуецца да пасяўной. Гэта пацвердзіла і **Наталля АНДРЭЙКАВЕЦ, агародніца з 18-гадовым стажам з вёскі Высокае,** да якой мы завіталі найперш:

— З 20 студзеня я ўжо высейваю насенне на расаду і месяц трымаю яе ў хаце. Адпачынак у нас толькі напярэдадні Новага года. Пасля Вадохрышча зноў у працу. Бывала, што і па дзве-тры гадзіны спім у сезон.

У руках Наталлі БАЛЮК, начальніка комплексу ААТ «Агра-Моталь», прабіркі з малюсенькімі парасткамі бульбы.

Наталля з мужам выхоўваюць трох сыноў. Галава сям'і пры гэтым працуе ў сельпо. Жанчына па адукацыі таваравед, аднак пакінула працу, каб заняцца справай на зямлі.

— Мне гэта падабаецца, да таго ж так я зарабляю больш. Першую цяпліцу збудавалі на тыя грошы, што падарылі нам на вяселле. Цяпер яна равесніца старэйшага сына, — расказвае Наталля і раіць: — Не бойцеся ставіць драўляныя канструкцыі, гэта не на год ці два. З часам можна і падрамантаваць. Гэта прасцей, чым набываць дарагі металапрофіль.

У закрытым грунце ў гаспадыні 20 сотак зямлі пад агуркі, таматы, перцы. Каля двух гектараў пад капусту, бульбу, буракі. Вырошчваюць і часнок, і цыбулю.

— За сезон стараемся на месцы, дзе былі, скажам, ранняя морква і капуста, пасадзіць на другі севазварот брокалі, пекінскую і цвятную капусту.

На вуліцы мароз, але многія ўдзельніцы праекта стаяць з блакнотамі і старанна канспектуюць, што ім кажуць. Многія запісваюць каштоўныя парады на тэлефон, фатаграфуюць, як што зроблена, і задаюць безліч пытанняў.

Цікавяцца, напрыклад, ураджайнасцю агуркоў і севазваротам у цяпліцы.

— Найлепшы вынік — тона з соткі, — адказвае Наталля. — А каб збудаваць цяпліцу, на сотку неабходна 1000 рублёў.

«АГУРКОВЫЯ» ДОЛАРЫ

Цяпліцы ўражваюць сваімі памерамі і ўладкаванасцю. Спачатку Наталля паліваа культуры са шланга. Цяпер тут кропельны паліў. У другім парніку летась раслі памідоры. Іх, ужо высахлыя, пакінулі да вясны, каб лягчэй было выцягваць карэнне.

А ў рассадніцы — памяшканні, дзе даходзіць да кандыцыі прарошчаная культура, пад вялізнымі сталамі складзены спецыяльныя печы, каб тэмпературу падтрымліваць: напачатку 27—28 градусаў, пасля — 23. Калі холадна, то трэба паліць кожныя дзве гадзіны. Многія тут жа нагінаюцца, мацаюць, каб зразумець, як гэта зроблена. Неўзабаве на гэтых стэлажах з'явіцца каля шасці тысяч каліў агуркоў, якія адправяцца ў цяпліцу ўжо як заквітнеюць — у канцы лютага.

Выкарыстоўвае Наталля толькі галандскія сарты агуркоў і раіць не баяцца самастойна збіраць насенне таматаў. Кажа, што «брудныя» сотка прыносіць да тысячы «агурковых» долараў. Агароднікі вельмі залежаць ад надвор'я і імкнуцца вырасціць раннюю прадукцыю, бо з яе найбольшы прыбытак.

— Не ўтойвайце адно ад аднаго, што ў вас адбываецца. Нешта не атрымалася — кажыце. Штосьці ўрадзіла — паказвайце. Гэта вельмі важна. І я заўжды ўсё запісваю: колькі пасадзіла, што вырасла, пачым прадала, каб разумець, ці рэнтабельна я спрацавала, — раіць Наталля будучым прадпрымальнікам. — У нас 100 двароў і 500 жыхароў, і, можа, толькі 10 % людзей не займаюцца вырошчваннем агародніны на продаж.

КАЛІ ЎЛЕЗ У ДУГУ — НЕ КАЖЫ НЕ МАГУ

Праз два-тры тыдні будзе накрываць плёнкай сваю цяпліцу памерам 2,8 сотні **Сяргей СЕНЬ, які вядзе ўласную падсобную гаспадарку ў вёсцы Белавуша.** Да яго мы завіталі, каб паслухаць, як можна зарабляць на капусце і бульбе.

Цяпліцу пад сваю расаду Сяргей награвае трыма «буржуйкамі». На дровы ідзе да тысячы долараў. А на паліў гектара раслін — да трох тысяч тон вады, адсюль і ўраджайнасць. Як толькі расада капусты адпраўляецца на поле, у цяпліцу саджаюць агуркі.

Духмяная вітамінная прыгажосць прадаецца ўвесь год і можа даляжаць у фруктасховішчы да вясны.

1-1,5 гектары ранняй капусты, столькі ж ранняй бульбы, 1-2 гектары цыбулі, 30 сотак буракоў — гэта прыкладная гаспадарка прадпрымальніка. Летась ён прадаў з яе каля 300 тон прадукцыі. Усе плошчы апрацоўвае некалькі сем'яў. Сяргей з жонкай і двума сынамі, цесць з цешчай і швагер з жонкай і дзецьмі.

— Цешча ўжо не працуе ў полі, аднак, калі б мы ні вярнуліся дадому, нас чакае накрыты стол або яна збірае торбы з гарачай ежай, а нехта падскочыць і забярэ. Даходы дзелім згодна з тым, колькі сродкаў кожны з нас уклаў на пачатку справы. Без звышнатуральнай дакументацыі.

8—15 сакавіка Сяргей выкладае бульбу на прарошчванне. А саджаць яе ў глебу, кажа, трэба, як глеба паспее. Гэта калі груду кінеш на зямлю, і яна рассыплецца на кавалачкі.

Калі Сяргей пералічвае сарты бульбы, якія вырошчвае, прысутныя старанна запісваюць і нават просяць гаварыць павольней, каб паспець.

Буйную бульбу ён рэалізуе па добрай цане, а дробную — за капейкі людзям на корм скаціне прадае.

— А як вы змагаецеся з жукамі? — цікавяцца ў гаспадара.

— Звычайна атрутай. У нас іх процьма, не паспее бульба вылезці, а на ёй ужо каля 20 сядзяць. Гэта ў вас там халадней, на Аршаншчыне, дык іх менш. Я з сабой абавязкова на развод вазьму, як прыеду вам дапамагаць, — смяецца Сяргей.

Цяпер гаспадар апрацоўвае чатыры гектары зямлі, аднак кажа, што, калі б была магчымасць, рабіў бы і на 20. І раіць: «Як узяўся за гуж, не кажы, што спіна баліць».

БЕЛАЯ ЗАЙЗДРАСЦЬ І КААПЕРАЦЫЯ

Столінскі край — тэрыторыя цяпліц. На прыватных участках тут каля 500 гектараў парнікоў. Больш як 10 тысяч мясцовых сем'яў займаюцца аграбізнесам. Прычым акрамя агародніны тут усё больш зямлі займаюць клубніцамі ды буякамі. Узяць зямлю ў арэнду ў раёне — задача амаль невыканальная, кожная пядзя тут занятая.

— Летась год быў няўдалы на агуркі, дык людзі зарабілі на капусце. Заўжды трэба мець нейкую культуру на запас, калі асноўная не ўродзіць, — расказвае **Віктар ВЕЛЯСНІЦКІ, дырэктар Столінскага цэнтра сельскага развіцця.** — Да таго ж аграбізнес цягне за сабой стварэнне іншых паслуг. Напрыклад, праз вялікую колькасць плёнкі з цяпліц, якую мяняюць, мы стварылі невялічкае прадпрыемства па яе перапрацоўцы. Адкрыліся арганізацыі па пабудове цяпліц, па продажы інвентару і рамонце сельгастэхнікі.

Ён расказаў, як цэнтр працуе з людзьмі: робіць аналіз глебы і праводзіць тэсты, каб пабачыць, як паводзяць сябе расліны падчас росту, арганізуе сумесныя закупкі насення, плёнкі і іншых сродкаў. Растлумачыў, чым небяспечнае невыкананне правіл. Як пара слоў агранома могуць выратаваць сезон лепш, чым разумныя кнігі...

— Кансультант можа дапамагчы вам арганізаваць працу, а не расказаць, што рабіць, каб разбагацець, — упэўнены дырэктар. — Зайздрасць да суседа павінна быць белай, каб можна было разам займацца аграбізнесам.

З ПРАБІРАК НА ГРАДЫ

На трэці дзень удзельнікі праекта наведалі лабараторыю мікракланальнага размнажэння раслін ААТ «Агра-Моталь» у Іванаўскім раёне.

Тут займаюцца ажынамі, бружмелем, дэкаратыўнымі раслінамі. З вочка бульбы вычляняюць мерыстэму, якая відаць толькі пад мікраскопам, і з яе ў прабірках вырошчваюць парасткі бульбы, з якой пасля ў цяпліцах атрымліваюць міні-клубні для элітнага насення.

Чатырохузроўневая цяпліца, што з'явілася ў гаспадарцы летась, пачынае работу ў два цыклы: у красавіку і жніўні.

— У ёй аўтаматычна падтрымліваецца мікраклімат. І мы можам атрымаць тут стапрацэнтна бязвірусныя міні-клубні і ягадныя расліны, — кажа **Наталля БАЛЮК, начальнік комплексу.** — У прабірках у нас расце не толькі бульба, але і ружы, рададэндроны. З пупышак адной расліны, напрыклад, можна атрымаць да 15 кустоў кветак.

Завіталі мы і ў сховішчы для агародніны і садавіны, дзе пабачылі лініі па сартаванні і ўпакоўцы бульбы і капусты. Убачылі, як бульбу аўтаматычна мыюць перад рэалізацыяй.

Паглядзелі, як чысцяць бульбу, моркву, цыбулю, якія тут жа вакуумуюцца і пад заказ адпраўляюцца на прадпрыемствы. Пакаштавалі яблыкаў і яшчэ больш натхніліся ідэяй уласнага бізнесу на зямлі. Тым больш што «Прадпрымальная землеўласніца» — праект, разлічаны на ўвесь год. І гэтая трохдзённая экскурсія — толькі адукацыйная частка, пасля якой пачнецца практыка.

Ірына СІДАРОК.
Фота Андрэя САЗОНАВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Узденский» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **зерносклада (в состав входит пристройка), инв. № 623/С-58842 общей площадью 293,7 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625680212901000267 площадью 0,1225 га по адресу: Минская область, Узденский район, Дещенский с/с, д. Теляково** *(земельный участок имеет ограничения прав в использовании: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, площадь – 0,0119 га)*. Земельный участок принадлежит продавцу на праве постоянного пользования.

Условия продажи:

1. Улучшить эстетический вид Объекта: ремонт входных дверей, частичная замена кровли, установка окон, благоустройство земельного участка, отведенного для обслуживания Объекта, и наведение на нем порядка, в течение 3 месяцев с момента подписания акта приема-передачи Объекта;

2. Разработать проектно-сметную документацию, провести проектно-изыскательские работы в срок не позднее 6 месяцев с момента получения разрешения, если иное не предусмотрено законодательством;

3. Провести реконструкцию (строительство) Объекта в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией, с окончанием строительства не позднее 2 лет с даты государственной регистрации перехода права собственности на Объект, если иное не установлено решением Узденского районного исполнительного комитета;

4. Ввести Объект в эксплуатацию в течение 3-х лет с момента заключения договора купли-продажи, если иное не установлено решением Узденского районного исполнительного комитета;

5. Использовать земельный участок в строгом соответствии с действующим законодательством;

6. Запрет на отчуждение Объекта до его ввода Покупателем в эксплуатацию;

7. Поддерживать надлежащее санитарное, техническое состояние Объекта и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) Объекта до его сноса (гибели).

Начальная цена объекта с НДС (20 %) **– 4 092,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены **– 409,20** бел. руб.)

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **26.02.2019** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.02.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Минский районный комбинат бытового обслуживания» (продавец проводит открытый аукцион по продаже **здания комплексного приемного пункта «Новый» общей площадью 95,8 кв. м, инв. № 600/С-128032, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623681315601000329 (предоставлен на праве постоянного пользования) площадью 0,0165 га, по адресу: Минская область, Минский район, аг. Новоселье, ул. Поддубная, 2а.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **27 840,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **2 784,00** бел. руб.).

Условия продажи:

– благоустройство земельного участка, отведенного для обслуживания недвижимого имущества, и наведение на нем порядка в течение трех месяцев с момента подписания акта приема-передачи недвижимого имущества;

– поддержание надлежащего санитарного, технического состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) объекта до его сноса (гибели);

– использование земельного участка в строгом соответствии с действующим законодательством.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **26.02.2019** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.02.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Планар» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **одноэтажного кирпичного здания многофункционального с пристройкой, общей площадью 1025,3 кв. м, инв. № 601/С-28859, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623288000016000002 (право постоянного пользования) площадью 0,9668 га,** *(часть здания пл. 239,4 кв. м – сдается в аренду)*. **Объект расположен по адресу: Минская область, Логойский район, Янушковичский с/с, 10.** Целевое назначение земельного участка – для обслуживания здания многофункционального. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: *охранная зона линий электропередачи напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,9668 га). Часть здания пл. 239,4 кв. м сдается в аренду.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **93 600,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **9 360,00** бел. руб.).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 (двух) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **25.02.2019** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.02.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ ОБ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ЧЕТВЕРТОГО ВЫПУСКА ОБЩЕСТВА С ОГРАНИЧЕННОЙ ОТВЕТСТВЕННОСТЬЮ «СтройИнфоКонсалт»
ТАВАРЫСТВА З АБМЕЖАВАНАЙ АДКАЗНАСЦЮ «БудІнфаКансалт»

1. Полное наименование:

на русском языке – общество с ограниченной ответственностью «СтройИнфоКонсалт»;

на белорусском языке – таварыства з абмежаванай адказнасцю «БудІнфаКансалт».

Сокращенное наименование:

на русском языке – ООО «СтройИнфоКонсалт»;

на белорусском языке – ТАА «БудІнфаКансалт».

2. Общество с ограниченной ответственностью «СтройИнфоКонсалт» (далее по тексту – Эмитент) было зарегистрировано решением Мингорисполкома от 11 января 2010 года в ЕГР за № 191162346.

Место нахождения Эмитента: Республика Беларусь, 223021, Минская область, Минский район, Щомыслицкий с/совет, аг. Озерцо, ул. Звездная, д. 21, помещение 11. E-mail: iinna68@mail.ru, www.dom-ozertso.by. Тел./факс (+37517) 512 52 81.

3. Основным видом деятельности Эмитента является реализация проектов, связанных со строительством зданий.

4. Сумма зарегистрированного уставного фонда Эмитента составляет 120,00 (сто двадцать) белорусских рублей 00 копеек.

5. Общий объем четвертого выпуска жилищных облигаций Эмитента составляет 900 000,00 белорусских рублей. Количество эмитируемых облигаций составляет 600 штук. Номинальная стоимость жилищной облигации четвертого выпуска составляет 1500,00 белорусских рублей и имеет эквивалент номинальной стоимости равный одному метру квадратному общей площади жилого помещения в строящемся жилом доме № 5 в составе объекта «Многоэтажные жилые дома в д. Озерцо Щомыслицкого сельсовета. Корректировка», 8-я очередь строительства.

6. Исполнение обязательств Эмитента по жилищным облигациям четвертого выпуска обеспечивается страхованием ответственности за неисполнение (ненадлежащее исполнение) обязательств Эмитента облигаций на основании договора, заключенного Эмитентом с БРУСП «Белгосстрах» и с СООО «Белкоопстрах» (договор № 005087-18/3136 добровольного страхования ответственности за неисполнение (ненадлежащее исполнение) обязательств Эмитента облигаций от 29 ноября 2018 года). Указанное обеспечение действует в течение всего срока обращения жилищных облигаций, а так же в течение трех месяцев после окончания срока обращения жиилищных облигаций.

7. Номер счета Эмитента на который будут зачисляться средства, поступающие при размещении жилищных облигаций: текущий счет № BY81BAPB30122497500170000000 в Региональной дирекции по г. Минску ОАО «Белагропромбанк», БИК BAPBBY2X.

9. Депозитарное обслуживание Эмитента осуществляет депозитарий – Республиканское унитарное предприятие «Республиканский центральный депозитарий ценных бумаг».

Юридический и почтовый адрес депозитария Эмитента: 220004, г. Минск, ул. Мельникайте 2, 4-й этаж.

Дата и регистрационный номер депозитария Эмитента как юридического лица, наименование регистрирующего органа: Мингорисполком, № 100967318 от 6 марта 2003 года; номер специального разрешения (лицензии) № 02200/5200-4-1111 на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, выданное Министерством финансов Республики Беларусь.

10. С более подробной информацией и с проспектом эмиссии жилищных облигаций можно ознакомиться в открытом акционерном обществе «Интертраст групп» по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, д. 28А, комн. 513.

Директор И. В. Иванская

Главный бухгалтер А. А. Карпеко

РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже квартиры, принадлежащей ОАО «Тепличный комбинат Мачулищи» (продавец)

Лот № 1. Квартира № 388, инв. № 500/D-708116683. Площадь – 93,9 кв. м. Г. п. – 2013. 3 комнаты. Адрес: г. Минск, пр-т Дзержинского, 23-388. **Начальная цена (без НДС) – 256 000,00 бел. руб. Задаток – 38 400,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %**

Аукцион состоится 05.02.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже квартиры, принадлежащей ОАО «Тепличный комбинат Мачулищи», проводимом 05.02.2019 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 01.02.2019 в 11.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта – Андрейчиков Александр Александрович, тел. 8 (029) 650-82-30. Первое, полное извещение о проведении аукциона, опубликовано в газете «Звязда» от 29.11.2018.

Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

Информация о формировании реестра владельцев ценных бумаг

Открытое акционерное общество «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс», находящееся Республика Беларусь, г. Гомель, ул. Лещинская, 49, на основании решения наблюдательного совета от 18.01.2019 года для проведения очередного общего собрания акционеров определило дату сбора реестра акционеров – 1 февраля 2019 года.

УНП 400078768

ОБЪЯВЛЕНИЕ О СНЯТИИ С ТОРГОВ

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» сообщает о снятии с аукционных торгов, назначенных на 28.01.2019 и 12.02.2019, имущества ОАО «Классика индустрии моды». Конт. тел.: (0212) 24-63-14, 510-07-63.

УНП 301322012

В связи с утерей считать недействительным страховые свидетельства филиала СООО «Белкоопстрах» в г. Минске по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ № 1162171, 1163574.

УНП 100706519

Открытое акционерное общество «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс» извещает своих акционеров о проведении 1 марта 2019 года очередного общего собрания акционеров

Повестка дня:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2018 год и основных направлениях деятельности Общества в 2019 году.
2. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности общества за 2018 год.
3. Отчет наблюдательного совета.
4. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2018 год.
5. Утверждение распределения чистой прибыли за 2018 год. О выплате дивидендов за 2018 год.
6. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2019 году и первом квартале 2020 г.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. Утверждение условий материального вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Место проведения собрания – г. Гомель, ул. Лещинская, 49, актовый зал.

Время начала проведения собрания – 14.00.

Время регистрации участников собрания – в день проведения собрания с 13.30 до 14.00 по предъявлению документа, удостоверяющего личность, а представителей акционеров – и доверенности.

Время и место ознакомления акционерами с материалами по вопросам повестки дня собрания – в рабочие дни, начиная с 8 февраля 2019 года по месту нахождения Общества с 13.00 до 16.00, в день проведения собрания – по месту проведения собрания с 11.00. до 13.00.

Формирование реестра акционеров – 1 февраля 2019 года.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 1 февраля 2019 года.

Наблюдательный совет.

УНП 400078768

Унитарное предприятие «Поречье Белкоопсоюза» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже административного здания, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Платонова, д. 31а

Лот № 1. Административное здание инв. № 500/С-46538. Назначение: здание административно-хозяйственное. Составные части – одноэтажный каменный дом с одной отапливаемой пристройкой (14 кв. м) и двумя холодными пристройками (20 кв. м и 7 кв. м). Г. п. – 1948. Этажность – 1. Площадь общая / застройки – 85,7 кв. м / 123 кв. м.
Начальная цена продажи – 38 710,80 бел. руб., в т. ч. НДС 20 %. Задаток – 3 871,08 бел. руб. Шаг аукциона 5 % – 1 935,54 руб.

СВЕДЕНИЯ О ЗЕМЕЛЬНОМ УЧАСТКЕ

Земельный участок, кадастровый номер 500000000008001584, по адресу: г. Минск, ул. Платонова, д. 31а, пл. 0,0311 га. Назначение – З/У для эксплуатации и обслуживания административного здания. Договор аренды от 30.05.2012 на срок по 28.02.2022. ОБРЕМЕНЕНИЯ: охранная зона водопровода, площадь 0,0163 га, охранная зона телефонной канализации, площадь 0,0062 га. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендент на покупку должен заключить договор купли-продажи Объекта в течение 10 (десяти) дней после аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен оплатить стоимость Объекта в течение 30 (тридцати) дней, а также возместить Продавцу расходы, понесенные в связи с проведением аукциона в течение 3 (трех) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
3. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

Аукцион состоится 25.02.2019 г. в 14.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Татарская, 3-309

Для участия в аукционе обращаться к организатору и продавцу объекта: унитарное предприятие «Поречье Белкоопсоюза», 220035, г. Минск, ул. Татарская, 3-316, тел. **(017) 203 09 84.**
Задаток перечисляется на р/с BY41BAPB30122772800100000000 в ЦБУ № 510 Региональная дирекция по Минской области ОАО «Белагропромбанк», БИК BAPBBY2X, УНП 101342082.
Назначение платежа: задаток для участия аукционе по продаже Лота № 1, проводимом **25.02.2019 г.**
Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в г. Минск, ул. Татарская, 3, кадрово-юридической группой до 16.00 **22.02.2019 г.**
Лот может быть снят с аукционных торгов Организатором аукциона по решению Продавца в любое время, но не позднее, чем до начала торгов

Контакты: e-mail: urist@porech.by; **(017) 203 09 84,**
Велком: +375293436265 – Андрей Валерьевич,
+375445920267 – Борис Федорович; **МТС: +375292356634**

ЗАО «Белреализация» объявляет о проведении торгов

ЗАО «Белреализация» уведомляет о переносе публичных торгов в электронной форме по продаже имущества в исполнительном производстве на **15 февраля 2019 г. 09.00–18.00** на электронной торговой площадке WWW.BELTORGI.BY**.** Извещение о проведении торгов ранее опубликовано в «Сельской газете» от 25.10.2018 г., 22.11.2018 г.

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27. тел.: (8017) 298-53-53, +375 29 690-54-09, e-mail: marketing@zalog.by. Телефон для ознакомления и осмотра лотов +37529 698-53-03.

Наименование лота	Местонахождение	Начальная цена, бел. руб.	Собственник
Капитальное строение с инв. № 350/С-56801	г. Гомель, ул. Севастопольская, 39А	15 840,00	ОДО «КАИ Стройсервис»

Для участия в торгах необходимо: 1) **в срок по 14 февраля 2019 г. 16.00** перечислить задаток по выбранному лоту в размере 10 % от начальной стоимости лота; 2) подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте WWW.BELTORGI.BY. Величина первого шага торгов составляет 5 % начальной стоимости лота. Победителем торгов признается участник торгов, предложивший наибольшую цену за лот. Победитель торгов (покупатель) обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов. Подробнее на WWW.BELTORGI.BY

Беларучский сельский исполнительный комитет сообщает о проведении 27 февраля 2019 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

Номер лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь, га	Инженерная и транспортная инфраструктура	Начальная цена, бел. руб.	Расходы по подготовке зем. документации	Сумма задатка, бел. руб.
Аукцион по продаже земельных участков гражданам в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома						
1	Минская область, Логойский район, д. Мерковичи, ул. Лесная, 21 земельный участок с кадастровым номером 623280405101000070	0,1491	Возможность подключения к электро-, водо- и газоснабжению, подъезд с грунтовой дороги	8 700,00	*1 604,07 + публикация в газете*	870,00
2	Минская область, Логойский район, д. Корбачевка, У-1 земельный участок, кадастровый номер 623280403601000078	0,1486	Возможность подключения к электро-, водоснабжению, подъезд с грунтовой дороги	7 400,00	*2134,20 + публикация в газете*	740,00
3	Минская область, Логойский район, д. Корбачевка, У-12 земельный участок, кадастровый номер 623280403601000074	0,1354	Возможность подключения к электро-, водоснабжению, подъезд с грунтовой дороги	7 200,00	*1211,40 + публикация в газете*	720,00

Задаток (10 % от начальной цены) перечисляется на расчетный счет № BY97AKBB36006190111210000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК банка AKBBBY2X, код платежа 4901, УНН 600537220 (600181549), получатель – Беларучский сельский исполнительный комитет.

Аукцион состоится 27 февраля 2019 года в 10.00 по адресу: Минская обл., Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17. Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00–13.00 с 14.00–17.00 по адресу: Минская обл., Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17. **Последний день приема заявлений – 22 февраля 2019 года до 17.00. Контактные телефоны: (801774) 28636,28945, 8-029-1955545.**

Наш чалавек!

Жыццё пражыць — не песеньку спець

— А што вы пішаце? — спытала неяк у свайго прадзядулі.
— Аўтабіяграфію. Во, паглядзі, — сказаў ён і працягнуў мне лісток з радкамі акуратных літар і лічбаў. — Нават ты, нябось, усяго не запомніш, а ведаць — трэба...

Нарадзіўся мой прадзед Сяргей Васілевіч Давідзюк 31 студзеня 1924 года ў вёсцы Грынявічы. Цяпер гэта Пружанскі раён Брэсцкай вобласці. У яго бацькоў было васьмёра дзяцей, таму ўсім і з ранняга маленства даводзілася вельмі няпроста. З шасці гадоў прадзядуля пачаў зарабляць на хлеб. У школу, праўда, хадзіў. Вучыўся спачатку на польскай мове, а пасля 39-га — ужо на рускай.

Калі пачалася вайна, яго брата забралі на фронт, і сям'і стала куды цяжэй. Трэба было неяк пракарміцца, выжыць, даймала пастаянная трывога за блізкіх, за лёс старэйшага брата...

У Германію на прымусовыя работы трапіў і ён, малодшы. Расказваў, што кармілі там вельмі дрэнна, а вось смерцю палохалі — увесь час...

У канцы вайны прадзеда вызваліла Чырвоная Армія, і ён адразу ж напісаў заяву на фронт. Радавога Давідзюка запісалі артылерыстам у 200-ы полк 2-й дывізіі 3-га Беларускага фронту і накіравалі ў горад Кёнігсберг (цяпер Калінінград).

«Мы трапілі туды ў самым пачатку красавіка, — успамінае прадзядуля, — у час напружаных баёў за горад. Гітлераўскае камандаванне было ўпэўнена ў яго непрыступнасці, таму пытанне аб капітуляцыі не стаяла... Крэпасць вырашылі браць штурмам. Памятаю, як да нас падышоў камандзір роты — паказаў, адкуль страчыць нямецкі кулямёт. Сказаў нам біць туды і — галоўнае — трапна. Мы беглым агнём пусцілі тры снарады, і ўсё заціхла. Калі асеў пыл, зразумелі, што наша ўзяла! «Слава артылерыі!» — закрычаў камандзір. Дзявятага красавіка 45-га года крэпасць пала».

Потым у прадзеда была служба на Украіне, на Далёкім Усходзе і Курыльскіх выспах. Факт, што ў родную вёску Сяргей Васілевіч Давідзюк вярнуўся толькі праз два гады з медалямі «За адвагу», «За ўзяцце Кёнігсберга» і ордэнам Айчыннай вайны II ступені.

Тут, на радзіме, ён пражыў жыццё, разам з прабабуляй выгадаваў чацвярых дзяцей, мае дзесяць унукаў і чатырнаццаць праўнукаў.

...Яму, ветэрану Вялікай Айчыннай вайны і старэйшыне нашага роду, у хуткім часе споўніцца 95! Мы, вядома ж, будзем віншаваць яго з гэтай датай, зычыць моцнага здароўя ды сонечнага настрою. І будзем дзякаваць — за перамогу, за нястомную працу і мудрасць.

Анастасія Каспярук,
г. Мінск.

Смех смехам

ПАД'ЕХАЎ...

На нашай вуліцы жыве сімпатычная дзяўчына Зоя.

— Пайшла яна неяк у краму і па дарозе сустрэла знаёмага хлопца, — расказвала маці яе. — Той спытаў: «Ты, Зоя, адвучылася ўжо ці не?» — «Вучуся яшчэ», — адказала дзяўчына. — «А замуж ісці не думаеш?» — «Не. Чакаю прынца на белым кані».

Пагаварылі яны так ды і разышліся. А надвячоркам мы з суседкамі запыніліся на вуліцы. І Зоя да нас падышла — стаім... Раптам чуем: нехта конна імчыць... На белым кані. Прыгледзеліся — той самы Андрэй. Павітаўся з намі ды кажа: «Зоя, ну паглядзі, чым я не прынц? Бачыш — на кані...»

— З таго дня і сустракаюцца, — расказвала нядаўна Зоіна маці. — Не ведаю, чым гэта скончыцца?

— Прыгожа пад'ехаў, — кажам мы ёй, — дык, можа, і вяселлем?

С. Атрохава,
Слуцкі раён.

Спявай, душа!

«Наш Сымоне плеш прыдбаў

На усю макушку...»

Пеў і песні, і прыпеўкі
Мой народ ва ўсе часы.
Не пяюць сягоння дзеўкі:
Пракурылі галасы.

Ехаў Яначак у сваты,
Усім хваліўся, што багаты:
Кот, сабака ды вядро
Вось і ўсё яго дабро!

На паляне пышны граб,
Рос ды выхваляўся.
Ясь «мільён» меў дзевак,
баб —
Бабылём застаўся.

Наш Сымоне плеш прыдбаў
На усю макушку.
Часта вата, мусіць, спаў
На чужых падушках?

Словы Саўка перайначыў,
Ды хіба ж да толку?
«Мазду» тачкаю празваў,
А дзяўчыну — цёлкай.

Мела форсу цётка Вера:
— Завяла я кавалера!
Толькі гэты жанішок,
Абакраў яе ды ўцёк.

Любоў Чыгрынава,
г. Мінск.

Сам-насам... З усімі

РАБІ, ШТО МОЖАШ, І ХАЙ БУДЗЕ, ШТО БУДЗЕ

Праўду кажуць, што год дзеліцца на дзве паловы: у першай мы чакаем лета, у другой — Каляд ды Новага года. А напярэдадні — жывыя пакуль традыцыі — спяшаемся з віншаваннямі, найлепшымі пажаданнямі, словамі ўдзячнасці. Што добра, не толькі па тэлефоне, бо званок празвіней ды растварыўся недзе ў прасторы: у навагоддзе ў досыць напружаным рэжыме працуе пошта, дастаўляе (у тым ліку на адрас газеты) паштоўкі, лісты. Многія з іх — не без таго — з розных міністэрстваў і ведамстваў, з установ, прадпрыемстваў, многія — ад нашых чытачоў.

Па-рознаму яны і напісаны: ёсць так званым кароткім, можна сказаць тэлеграфным, радком (накшталт: «Цудоўны калектыў аднадумцаў віншуем... Зычым новых ідэй... Тыражоў... Грошай...), і больш разважлівым, спакойным. Ну вось, напрыклад: *«Пытання, што выпісваць на новы квартал, на новы год,* — піша **спадарыня Таіса Несцяровіч са Смалявіччыны,** *— для мяне асабіста даўно не існуе: вядома ж, «Звязду». Не ўяўляю: як гэта без яе светласці, куды — без цёплай роднай мовы?!*

Падабаецца, што ў газеце можна прачытаць пра справы дзяржаўныя і сямейныя, пра здароўе, культуру, гісторыю, экалогію, пра школу і яе праблемы. А яшчэ даспадобы, што «Звязда» друкуе пісьмы, якія дасылаюць простыя людзі, часта з глыбінкі, з вёскі...

Я таксама пісала ў газету, удзельнічала ў конкурсе «Фотаздымак з гісторыяй», стала там пераможцам, атрымала падарунак. Дасылала і свае гісторыі на знакаміты звяздоўскі «провад». Таму цалкам згодная са спадарыняй Любоўю Чыгрынавай, што «без «Звязды» мы мянцілі б пра пустое... А цяпер — ужо не тое».

Гэта, як вы разумееце, быў «уступ» да віншаванняў. Зараз — яшчэ адзін: *«У цёплы час года мы з мужам жывём у вёсцы,* — піша **спадарыня Галіна Пятроўская са Смаргоні.** *— Там жа, у сваёй паштальёнкі, заўсёды афармлялі падпіску. Не забыліся на гэта і летась, праўда, з умовай, што потым, калі мы на зіму пераедзем у горад, за намі «пераедуць» і нашы газеты. Здавалася, праблем не павінна ўзнікнуць. Але ж пачаўся студзень, а «Звязды» няма. Насварылася на паштальёнку, на мужа, два дні ён абыходзіў кіёскі, каб купіць газету ў розніцу. Як высветлілася, там таксама яе не «злавіць»... І ведаеце, я неяк раней не задумвалася, што для мяне «Звязда». А тут — пуста ў хаце...*

Добра ўсё, што добра канчаецца, — паведамляе нарэшце шаноўная падпісчыца. *— Першы нумар нам аддалі на пошце з вітрыны, потым данеслі іншыя».* Новыя...

Спадарыня В. А. Лойка з Дзяржынска даслала ў рэдакцыю стары пажаўцелы нумар «Звязды» за 4 снежня 2004 года, прычым з прыпіскай: «Хавала для сябе. Але ж хай будзе вам».

У газеце — рэпартаж з сустрэчы, якую мы, звяздоўцы, праводзілі ў актавай зале райвыканкама. Прысутнічалі там многія, у тым ліку і нашы падпісчыкі, паштавікі. Мы расказвалі пра газету, праводзілі віктарыны... *«Я добра адказвала на ўсе пытанні,* — успамінае чытачка, *— атрымала ганаровы дыплом, прыгожую майку. Насіла яе гадоў з дзесяць... Цяпер майкі ўжо няма, а вось дыплом — захоўваю, як і вернасць газеце: зноў аформіла на яе падпіску...»*

Тое ж, трэба разумець, зрабіў і **спадар Іосіф Паўкалас з Маладзечаншчыны,** ад якога разам з віншаваннямі-пажаданнямі прыйшла падзяка за звяздоўскі (даслоўна) цуда-прыз у пазамінулым розыгрышы.

Што і казаць: прыемна чытаць падобныя лісты, прыемна ведаць, што сеем, калі можна гэтак сказаць, не на камень.

Але ж пішуцца гэтыя радкі зусім не для таго, каб пахваліцца. *«Газета «Звязда»,* — паведамляе **спадарыня Ніна Дзянісаўна Гапоненка з вёскі Броннае Рэчыцкага раёна,** *— перайшла да мяне па спадчыне. Мой бацька пачынаў працаваць паштальёнам, потым вучыўся, займаў досыць высокія пасады, у гады вайны быў начальнікам палявой пошты, узнаўляў сувязь у Мазыры.*

Не дзіва, што ў кватэру, дзе мы жылі, прыходзіла шмат газет. На іх, паміж радкоў (сшыткаў тады не было), я пісала, калі вучылася ў школе, калі паступіла вучыцца на фельчара-акушэра. Добра памятаю, што сярод іншых газет была і «Звязда». А пастаянна выпісваць яе стала з 1947-га. Мой муж тады скончыў партыйную школу, мы абодва працавалі, гадавалі дзяцей. Мяне да таго ж 27 гадоў выбіралі ў дэпутаты...

Цяпер мне за 90. Вёска вялікая, жыхароў каля 1300 чалавек, але «Звязды» ідзе зусім мала. Быў час, калі яна прыходзіла толькі да мяне і ў нашу бібліятэку.

Я задумала правесці агітацыю па падпісцы. Угаварыла адну сваю суседку, дамовілася з паштальёнкай, каб маё «Мясцовае самакіраванне» яна аддавала дэпутатам сельскага Савета. Так яшчэ адзін чалавек падпісаўся. Чаму не больш? Я думаю — маладзейшыя пакаленні, хоць і лічаць сябе беларусамі, але ў школе вучыліся на рускай мове.

А вось я люблю чытаць па-беларуску, таму «Звязду» заўжды брала ў рукі першай. Нават унук, калі быў малы, гэта ведаў. Даставаў са стоса іншых і казаў: «На... Твая любімая»...

Цяпер вочы ўжо не тыя, — прызнаецца шаноўная Ніна Дзянісаўна, дарэчы, выдатнік аховы здароўя СССР, *— але, атрымаўшы «Звязду», я хоць нешта ды пачытаю, патрымаю газету ў руках, і то мне радасць. Нехта з гэтага, можа, пасмяецца, але ж, пакуль жыву, я буду выпісваць сваю «Звязду».*

...Сказаць шчыры дзякуй — шаноўнай Ніне Дзянісаўне, якая разам з намі непакоіцца за лёс роднай мовы і любімай газеты, згадзіцеся, мала. Таму ў вёску Броннае, на адрас адной з найстарэйшых і такіх адданых чытачак будзе накіраваны ганаровы дыплом і невялічкі падарунак.

Да ўвагі іншых пастаянных і новых падпісчыкаў яшчэ адзін ліст. *«Больш за 20 гадоў я выпісваю і чытаю «Звязду», кіруюся яе парадамі ў падтрыманні здароўя, вырошчванні ўраджаяў на дачы, прыгатаванні страў, а галоўнае — атрымліваю сапраўдную асалоду ад сустрэч з беларускай мовай, народным гумарам, героямі многіх публікацый, якія трымаюцца свайго, нацыянальнага, роднага,* — піша **спадарыня Л. Сагановіч з Мінска.** *— І шкада, што ў рэальным жыцці такіх людзей сустракаецца мала. Вакол сябе я пастаянна чую рускую мову альбо тое, што ўкраінцы завуць суржыкам, а мы — трасянкай. Паслухаеш, і такая каша ў галаве... Што з гэтым рабіць?»*

Адказ на гэтае пытанне можа быць доўгім і шматслоўным. А можа — кароткім: рабі, што можаш (то-бок размаўляй і чытай па-свойму, вучы гэтаму дзяцей ды ўнукаў, выпісвай газеты і часопісы, купляй кнігі...), і хай будзе, што будзе.

Перажыла наша родная мова розныя часы. Перажыве, дасць бог, і нашу абыякавасць.

Пошту чытала
Валянціна ДОЎНАР.

УЛАДЗІМІР ПІЧЭТА. ПЕРШЫ РЭКТАР

Не беларус па паходжанні, ён стаў пачынальнікам нацыянальнай гістарыяграфіі, кіраўніком нацыянальнага ўніверсітэта, першым і адзіным заслужаным прафесарам Беларусі

Імя Уладзіміра Іванавіча Пічэты крыху выбіваецца з канцэпцыі нашай рубрыкі, у якой размова ідзе пра фактычна першых прадстаўнікоў беларускай нацыянальнай эліты, што прадвызначылі развіццё Беларусі як асобнага дзяржаўнага ўтварэння. Пічэта не быў беларусам па паходжанні, нарадзіўся далёка за яе межамі. Яго станаўленне як чалавека, навукоўца, грамадскага дзеяча адбывалася не на беларускай глебе, у навастворanую рэспубліку ён трапіў у даволі сталым узросце. Але не напісаць пра яго нельга, бо ў многім дзякуючы менавіта гэтаму чалавеку Беларусь уласную эліту і займела. Ён не быў палымяным рэвалюцыянерам, заўзятым марксістам ці бальшавіком. Ён проста аддана займаўся той справай, якую ўмеў рабіць на выдатна, — быў Гісторыкам і Выкладчыкам. Нам пашанцавала, што свой талент і імпэт на працягу дзесяці гадоў гэты чалавек скіроўваў менавіта на Беларусь. На стварэнне сістэмы вышэйшай адукацыі ў нашай краіне, на стварэнне гісторыі беларускага народа. Ці не зашмат для аднаго чалавека? Тады лічылася не зашмат. То былі часы вялікіх амбіцый і вялікіх здзяйсненняў.

«Герцагавінец па крыві»

Уладзімір Пічэта нарадзіўся ў 1878 годзе ва ўкраінскай Палтаве. Але ўкраінцам па нацыянальнасці ён быў толькі напалову: маці Марыя Рыгораўна Грыгарэнка была дачкой чыноўніка кіеўскай Казённай палаты. З бацькам Іванам (Ёванам) больш цікава. Ён нарадзіўся ў Мостары, гістарычным цэнтры Герцагавіны, быў па нацыянальнасці сербам. Здольнага да навук праваслаўнага юнака заўважылі і далі яму магчымасць вучыцца ў Расійскай імперыі. Там Іван Хрыстафаравіч змог зрабіць прыстойную кар'еру: стаў рэктарам спачатку Віцебскай, пасля Палтаўскай духоўнай семінарыі, атрымаў сан протаіерэя.

Наш герой без асаблівых цяжкасцяў ішоў праторaным шляхам прадстаўніка забяспечанай сям'і: спачатку скончыў у Палтаве гімназію, пасля — Маскоўскі ўніверсітэт, гісторыка-філалагічны факультэт. Выкладаў гісторыю і мовы ў розных кутках імперыі — куды пасылалі. Але маладому чалавеку з «крывёй герцагавінца» хацелася большага. У 1909 годзе ён здае ў сваёй альма-матар магістарскі экзамен, а праз год становіцца прыват-дацэнтам універсітэта. Праўда, не надоўга: у 1911 годзе разам з многімі калегамі звальняецца, пратэстуючы супраць кансерватыўнай палітыкі міністра народнай асветы Льва Касо. Згадваючы тыя гады, будзе пасля адзначаць, што «прытрымліваўся левага ўхілу».

Але, нягледзячы на «ўхіл», рэвалюцыянерам так і не стаў. Пачалася самая крывавая вайна ў тагачаснай гісторыі, выспявала рэвалюцыя, рушыўся свет, а Уладзімір Пічэта выкладаў і займаўся навукай. Найбольш яго цікавіла гісторыя Вялікага Княства Літоўскага, прынамсі, па ёй ён пісаў дысертацыю. Рэвалюцыю, мяркуючы па ўсім, прыняў спакойна, дый яна з ім, сынам высокапастаўленага святара, абышлася літасціва. У 1917 годзе Пічэта вярнуўся ва ўніверсітэт, а ўжо ў 1918-м абараніў работу «Аграрная рэформа Сігізмунда Аўгуста ў Літоўска-Рускай дзяржаве», за што і атрымаў ступень доктара рускай гісторыі.

Універсітэт з нуля

У 1918-м Пічэта ўжо прызнаны вучоны-гісторык, у самым росквіце творчых і фізічных сіл — яму толькі сорак. Яму цікавыя перапляценні лёсаў славянскіх народаў, іх гістарычныя ўзаемасувязі — пэўна, і ўласнае паходжанне тут адыгрывае сваю ролю. Ён адзін з нямногіх па тым часе даследчыкаў, хто піша ў тым ліку і пра беларусаў. Таму, калі ў Маскве ствараецца беларускі Народны ўніверсітэт, Пічэту запрашаюць туды выкладаць.

Але яго галоўны ўніверсітэт — асноўная справа яго жыцця — яшчэ наперадзе. У лютым 1919 года ўрад ССРБ стварае камісію па падрыхтоўцы стварэння Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Для гэтай важнай працы запрашаюць акадэміка Яўхіма Карскага (дарэчы, Карскі будзе працягваць падрыхтоўчую работу і падчас польскай акупацыі). Яшчэ адна падобная камісія ствараецца і ў Маскве, і па прапанове беларускага ўрада ў кастрычніку 1920 года яе ўзначальвае Уладзімір Пічэта. Карскага на той час ужо адклікалі ў Расійскую акадэмію навук, Ігнатоўскі займае ў рэспубліцы больш высокія пасады: спачатку наркама земляробства, пасля — наркама асветы. І калі паўстае пытанне аб аб'яднанні мінскай і маскоўскай камісій і вылучэнні кіраўніка, які пасля і стане рэктарам новаўтворанага ўніверсітэта, выбар падае на Пічэту. Маладой рэспубліцы, большасць жыхароў якой была элементарна непісьменная, для вышэйшай навучальнай установы патрэбен быў менавіта такі рэктар — аўтарытэтны, прызнаны і ўладай, і навуковымі коламі, і, галоўнае, — той, які прызнае права народа на самавызначэнне, на нацыянальную адукацыю, на падрыхтоўку нацыянальных кадраў, які бачыць у гэтым народзе нешта большае, чым насельніцтва былой імперскай ускраіны.

Уладзімір Пічэта быў менавіта такім рэктарам. А яшчэ ён не пабаяўся пачаць усё з нуля. Пакінуўшы цёплае месца ў Маскве (там ён на той момант працаваў у Цэнтральным архіве — мара любога гісторыка), ён прыехаў у разбураны вайной галодны Мінск. Дзеля таго, каб «стварыць кадры адукаваных работнікаў, якія шмат карысці прынясуць справе аднаўлення нашага краю» (так ён скажа ў кастрычніку 1921 года, у прамове з нагоды адкрыцця Белдзяржуніверсітэта).

Пачынаць сапраўды давялося з нуля. Сучасныя гісторыкі Алег Яноўскі і Артур Зельскі ў сваёй публікацыі, прысвечанай 125-годдзю Уладзіміра Пічэты, згадваюць успаміны намесніка дэкана факультэта грамадскіх навук (дэканам быў Усевалад Ігнатоўскі) Сямёна Вальфсона. «Не абыходзіўся той час і без кур'ёзных выпадкаў. Першы адбыўся ў першы ж дзень заняткаў, якія былі прызначаны на 12 гадзін раніцы 31 кастрычніка. А дзясятай гадзіне на факультэт прыйшоў намеснік дэкана С. Я. Вальфсон.

У актавай зале С. Я. Вальфсон сустрэўся з рэктарам. Уладзімір Іванавіч Пічэта самотна блукаў па вялізным пакоі, у якім неўзабаве павінна было пачацца ўніверсітэцкае жыццё. «Ведаеце, хутка ўжо пачнуць збірацца студэнты, а глядзіце што робіцца...», — звярнуўся рэктар да намесніка дэкана. У актавай зале цалкам адсутнічала мэбля. Як жа быць? У прымыкаючым да залы калідорчыку было навалена некалькі дзясяткаў услонаў і табурэтак, прывезеных напярэдадні з Наркамата асветы. У будынку нікога не было — ні служачых, ні прыбіральшчыкаў. Уладзімір Іванавіч сказаў: «Трэба спяшацца. Давайце будзем самі наводзіць парадак». І тады рэктар разам з намеснікам дэкана факультэта ўзяліся пераносіць і размяшчаць услоны. Знайшлі невялікі столік і прыстасавалі яго як «кафедру». На дзвярах С. Я. Вальфсон прымацаваў аркуш паперы з надпісам чырвона-сінім алоўкам: «Аўдыторыя № 1. Уваход у час лекцыі забараняецца». Хутка пачалі збірацца студэнты, а крыху пазней у перапоўненай зале да адказу соценны натоўп прагна слухаў першую лекцыю ў гісторыі Універсітэта «Аб культуры Міжземнага мора ў эпоху панавання Рыма», якую чытаў прафесар Д. П. Канчалоўскі. Так пачыналася універсітэцкае жыццё...»

Агульнапрызнаны сёння факт: у навастворaны ўніверсітэт прыехалі з Масквы і Петраграда найлепшыя па тым часе выкладчыкі, беларускія нацыянальныя дзеячы таксама не засталіся ўбаку ад навучальнага працэсу, хоць да гэтага і не мелі вопыту выкладання на такім узроўні. Гэта стала магчымым дзякуючы дбанню кіраўніцтва маладой рэспублікі — старшыні СНК Аляксандра Чарвякова і наркама асветы Усевалада Ігнатоўскага, а таксама бясспрэчнаму аўтарытэту ў навуковых і выкладчыцкіх колах рэктара БДУ Уладзіміра Пічэты і вялікай павазе, якой ён у гэтых колах карыстаўся.

«Бараніў беларускае культурнае існаванне»

У рэктара было нямала спраў, у тым ліку і гаспадарчых: па першым часе заняткі вяліся ў такой цеснаце, што выкладчыкі, нягледзячы на забарону, прымалі іспыты ў студэнтаў у сябе на кватэрах. Ужо ў сярэдзіне 20-х дбаннем рэктара пры падтрымцы кіраўніцтва рэспублікі быў закладзены першы камень універсітэцкага гарадка. Але за надзённымі справамі прафесар Пічэта не забываецца аб сваім галоўным прызванні — гістарычнай навуцы. Цягам свайго «беларускага дзесяцігоддзя» ён напіша 150 навуковых прац. Па гісторыі Беларусі, Украіны, Польшчы, Чэхіі, Баварыі, Літвы, па гістарыяграфіі, археалогіі, архівазнаўстве, краязнаўстве, гісторыі права Беларусі. На пачатку 20-х гадоў Пічэта часта ўдзельнічаў у пасяджэннях Мінскага «Таварыства гісторыі і старажытнасцяў», на якіх уздымаліся самыя актуальныя праблемы навукі і адукацыі. «У кастрычніку 1922 г. прагучала думка У. І. Пічэты аб тым, што беларускія гісторыкі павінны накіраваць свае намаганні на «стварэнне гісторыі беларускага народа, адмовіўшыся ад поглядаў на гісторыю Беларусі як на частку гісторыі Масквы, Польшчы ці Літвы». Ён заўсёды настойліва адстойваў неабходнасць прымянення дакладнай гістарычнай тэрміналогіі, бо выдатна разумеў неразрыўную сувязь паміж моўнай формай і гістарычным (а, мо, і палітычна завостраным) зместам. Таму не дзіўна, што вучоны падкрэслена настойліва ўжываў такія фармулёўкі, як «беларуска-літоўская дзяржава», «беларускі народ», — чытаем сведчанне даследчыкаў.

Яшчэ адзін цікавы момант біяграфіі першага рэктара — у 1921 годзе ў якасці эксперта ён прысутнічаў на працэсе падпісання Рыжскага дагавора і перамовах, якія яму папярэднічалі. Проста кажучы, дзяліў з польскім бокам архіўныя дакументы, адстойваючы права беларусаў на іх. У падручніках аб яго ўдзеле ў тых перамовах напішуць коратка, але так значна нават для нас сённяшніх: «ён, як адзначалася на святкаванні яго 25-гадовага юбілею навуковай дзейнасці, «бараніў беларускае культурнае існаванне».

Уладзімір Пічэта прыязна ставіўся да навучання на беларускай мове, вельмі хутка вывучыў яе сам (для прафесіянала-славіста гэта наўрад ці было складана), чытаў на ёй лекцыі, пісаў навуковыя працы. Праз шэсць гадоў існавання БДУ больш за палову лекцый у ім чыталася па-беларуску (былі яшчэ асобна яўрэйскае і польскае аддзяленні). А год пяцігоддзя БДУ — 1926, быў знакавы і для самога рэктара: шырока — з публікацыямі ў цэнтральнай прэсе, з урачыстымі мерапрыемствамі адзначалася і 25-годдзе яго навуковай дзейнасці. Спецыяльнай пастановай урада яму было нададзена ганаровае званне — заслужаны прафесар Беларусі. Такім чынам адзначылі яго вядучую ролю ў станаўленні БДУ, «існаваньне якога неразрыўна зьвязана з Вашым імем, як першага яго Рэктара», і яго навуковую дзейнасць, якая «зьяўляецца моцным грунтам для далейшага вывучэньня Беларускай краіны нашымі маладымі навуковымі сіламі». Уладзімір Пічэта і сёння застаецца першым і адзіным носьбітам звання заслужаны прафесар Беларусі: больш яго не прысвойвалі нікому.

Арыштаваны «па акадэмічнай справе»

Было б дзіўна, калі б першая хваля рэпрэсій на Беларусі не закранула такога чалавека. Але Пічэта быў занадта значнай велічынёй не толькі беларускага ўзроўню, каб абвінаваціць яго па груба сфабрыкаванай справе. Яго змаглі «зачапіць» толькі па «справе акадэмікаў» — у 1929—1930 гадах былі арыштаваныя больш за 100 навукоўцаў па ўсім Саюзе, у асноўным краязнаўцаў-гуманітарыяў. Уладзіміра Пічэту абвінавацілі адначасова ў вялікадзяржаўным шавінізме, беларускім буржуазным нацыяналізме і празаходняй арыентацыі. Год ён прабыў у Леніградскім доме папярэдняга зняволення, і гэта падарвала і фізічны, і маральны стан немаладога ўжо навукоўца.

Яго саслалі ў Вятку, дзе выдатны вучоны працаваў нарміроўшчыкам і табельшчыкам у кааператыве грамадскага харчавання. У 1934-м яго перавялі ў Варонеж, дазволілі выкладаць гісторыю ў мясцовым педінстытуце. А пасля здарылася па тых страшных часах дзіва: Уладзіміра Пічэту вярнулі ў Маскву, перагледзелі справу, дазволілі выкладаць, працаваць ва ўсесаюзнай Акадэміі навук, стварыць там сектар славяназнаўства. Даследчыкі лічаць, што такая раптоўная міласць улад магла быць звязана з прыездам у СССР міністра замежных спраў Чэхаславакіі Эдварда Бекіша, які ведаў Пічэту яшчэ ў бытнасць таго рэктарам БДУ і нібыта захацеў яго ўбачыць... У 1939 годзе Пічэту нават вярнулі званне акадэміка Акадэміі навук БССР. Але ў Беларусь Уладзімір Іванавіч больш ніколі не вярнуўся.

Да 25-годдзя БССР у студзені 1944 года Уладзімір Пічэта напіша дзіўны артыкул. Дзяжурныя фразы, абавязковыя для таго часу аб ролі савецкай улады і камуністычнай партыі. Аўтар называе сярод праціўнікаў якой бы то ні было беларускай дзяржаўнасці... Яўхіма Карскага, у наркамы земляробства аж да дваццаць пятага года запісвае... Адама Славінскага, а імя сапраўднага наркама, якога абвінавачвае ў патуранні аднаасобніцкім гаспадаркам (Дзмітрыя Прышчэпава), увогуле не можа прыпомніць. Ці Пічэта — выдатны гісторык, прызнаны эрудыт, сам пісаў гэты артыкул? А можа, сапраўды, зламаны і фізічна, і маральна, хацеў забыцца аб паплечніках, з якімі разам будаваў беларускую мару, з вяршыні якой абрынуўся, як і сотні іншых?

Памёр Уладзімір Пічэта ва ўзросце 68 гадоў у 1947 годзе і быў пахаваны, як і належыць акадэміку, на Новадзявочых могілках у Маскве.

* * *

У Мінску першага рэктара таксама памятаюць. У 1990-х гадах вялася размова аб тым, каб назваць яго імем вуліцу Ленінградскую, на якой стаяць некалькі карпусоў БДУ (тады ж хацелі перайменаваць Байкальскую ў Кірылы Тураўскага). Далей размоў не пайшло, але на будынку гістфака на Чырвонаармейскай з'явілася мемарыяльная дошка ў гонар Уладзіміра Пічэты, а на самім факультэце — аўдыторыя яго імені.

А беларускія гісторыкі і сёння лічаць яго сваім Настаўнікам. Бо «стварэнне гісторыі беларускага народа, адмовіўшыся ад поглядаў на гісторыю Беларусі як на частку гісторыі Масквы, Польшчы ці Літвы» — і цяпер актуальны запавет.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

Пытанне—адказ

Сэрца ці нервы не ў парадку?

Нядаўна ў мяне перыядычна здараліся прыступы задышкі, якія суправаджаліся пастаянным пачуццём недахопу паветра, пазяханнем. У аптэцы параілі прымаць глог з кальцыем і магніем, і праз пэўны час усё прайшло. Ці варты ўвагі такі стан і ці трэба ісці да ўрача? Ці можа ён быць звязаны з надвор'ем і тым, што давялося панерваваца?

Таццяна Аляксандраўна, 55 гадоў, *Мінск.*

Адказвае **загадчык аддзялення прафілактыкі 31-й гарадской паліклінікі Мінска Таццяна ПЛІСЮК.**

— На жаль, жанчына не ўдакладніла, у стане спакою ці падчас фізічнай актыўнасці ўзнікаюць такія адчуванні. А гэта важна для пастаноўкі дыягназу. Апісаны стан можа быць звязаны з суб'ектыўнымі адчуваннямі. У некаторых жанчын, напрыклад, цяжка праходзіць клімакс, і гэта можа быць адной з яго праяў. А магчыма, так дае аб сабе знаць цяжкая паталогія — параксізм фібрыляцыі перадсэрдзяў, або мігальная арытмія. Гэта найбольш распаўсюджаная разнавіднасць парушэнняў рытму сардэчных скарачэнняў і вельмі небяспечная — найперш тым, што пры доўгім яе існаванні аднавіць рытм бывае вельмі складана. Таму варта звярнуцца да тэрапеўта, здаць аналізы і падрабязна расказаць, што вы адчуваеце. Такую паталогію не заўсёды ўдаецца выявіць па кардыяграме сэрца, бо ў момант яе выканання рытм можа быць у норме. Таму прызначаецца сутачнае холтэраўскае манетарыраванне. Пацыент на працягу 24 гадзін носіць адпаведнае прыстасаванне і вядзе дзённік. Пазначае, калі ён дрэнна сябе адчувае, і ва ўрача ёсць магчымасць паглядзець, як у гэты час паводзіла сябе сэрца. Таму я б раіла найперш абследавацца, каб выключыць паталогію, звязаную з парушэннем рытму сэрца. І калі ўсё ў норме, тады можна разважаць пра вегетасасудзістую дыстанію, уплыў надвор'я, нерваванні і псіхасаматыку. І гэта сапраўды можа лячыцца глогам, сардэчнікам ці адаптолам.

Карысна ведаць

САМО НЕ ПРОЙДЗЕ



Што рабіць пры развіцці інсульту?

Штогод у свеце здараецца больш за 15 мільёнаў інсультаў. Сардэчна-сасудзістыя захворванні займаюць першае месца сярод прычын смяротнасці на планеце. Інсульт — біч сучаснасці. Сёння ён не толькі дастаткова сур'ёзна распаўсюджаны, але і істотна памаладзеў. Асноўная небяспека — у тым, што здараецца ён нечакана. Наступствы ж могуць быць самымі сур'ёзнымі, уключаючы смерць. Вакол самой хваробы шмат міфаў і памылковых думак.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— Інсульт — гэта вострае парушэнне кровазвароту ў галаўным мозгу, якое выклікае гібель мазгавой тканкі, — расказвае **ўрач вышэйшай катэгорыі аддзялення дзённага знаходжання 2-й цэнтральнай гарадской паліклінікі Мінска Алена ЛАПСАР**. — Асноўныя прычыны яго развіцця — артэрыяльная гіпертэнзія, атэрасклероз, анеўрызмы і анамаліі сасудаў галаўнога мозга, захворванні крыві. Вылучаюць гемарагічны (кровазліццё ў мозг) і ішэмічны (трамбоз мазгавых сасудаў) інсульт.

Гемарагічны інсульт развіваецца звычайна раптоўна, часта днём — пасля псіхічнага ці фізічнага перанапружання. Адзначаецца нечаканая страта прытомнасці, аж да комы, хворы падае. У яго можа пачырванець твар, з'явіцца пот на лбе, узмоцненая пульсацыя сасудаў на шыі, хрыплае, гучнае, булькаючае дыханне, артэрыяльны ціск высокі, пульс рэдкі, часам бывае рвота. Тэмпература цела павышаецца. Таксама вызначаецца параліч верхняй і ніжняй канечнасцяў, парушэнні мовы, раптоўнае пагаршэнне зроку.

Ішэмічны інсульт (яго яшчэ называюць інфаркт мозга) узнікае часцей пры атэрасклерозе сасудаў галаўнога мозга, стэнозе магістральных артэрый галавы (сонных, пазваночных), паніжэнні артэрыяльнага ціску ў выніку закупоркі мазгавога сасуда тромбам. Ішэмічнаму інсульту нярэдка папярэднічаюць парушэнні мазгавых функцый працягласцю не больш за суткі, якія паўтараюцца. З'ўляецца галаўны боль, галавакружэнне, хістанне падчас хадзьбы, слабасць ці аняменне канечнасцяў, якія праходзяць, страта прытомнасці, часам болі ў вобласці сэрца. Паралічы канечнасцяў пры ішэмічным інсульце развіваюцца паступова, найчасцей уначы падчас сну ці раніцай. Нярэдка чалавек кароткачасова страчвае прытомнасць, аднак свядомасць можа і не парушацца. Твар хворага бледны, пульс слабы, артэрыяльны ціск паніжаны (радзей павышаны), сардэчная дзейнасць і дыханне аслабленыя.

Важна памятаць, што інсульт — гэта неадкладны стан! Распаўсюджаны міф, што пры інсульце трэба стварыць спакой і камфорт, адляжацца, а ў бальніцу ехаць неабавязкова. Гэта не так. Калі толькі западозраны інсульт, неабходна неадкладна выклікаць хуткую дапамогу і накіроўвацца ў спецыялізаванае аддзяленне для лячэнне пацыентаў з інсультам. Агульнае правіла для людзей з інсультам: чым раней пацыент звярнуўся па медыцынскую дапамогу, чым раней трапіў у стацыянар, тым больш шанцаў у яго на выжыванне і эфектыўнае лячэнне. Таму не трэба чакаць: маўляў, а можа само пройдзе?

Падчас выкліку хуткай дапамогі варта дакладна апісаць дыспетчару ўсё, што адбылося, каб прыехала спецыялізаваная неўралагічная брыгада.

— Найбольш эфектыўнае лячэнне магчыма ў першыя тры (максімум шэсць) гадзін з моманту парушэння мазгавога кровазабеспячэння. Гэта так званае тэрапеўтычнае акно, калі яшчэ рэальна пазбегнуць развіцця ў мозгу незваротных змен, — звяртае ўвагу Алена Лапсар. — Многія выдатна ведаюць аб неабходнасці хутка выклікаць урача пры болях у сэрцы, а інсульт — яшчэ больш неадкладны стан!

Хворых з вострым інсультам шпіталізуюць у стацыянар, аснашчаны апаратурай для правядзення камп'ютарнай ці магнітна-рэзананснай тамаграфіі. Толькі з яе дапамогай можна канчаткова ўдакладніць дыягназ, а адпаведна, і правесці адэкватнае лячэнне.

ПАСЛЯ ТАГО, ЯК ВЫКЛІКАЛІ «ХУТКУЮ»

● Пакладзіце хворага так, каб галава была прыўзнята над узроўнем ложка прыкладна на 30 градусаў.

● Адкрыйце фортачку ці акно, каб у памяшканне паступала свежае паветра. Зніміце сціскаючае адзенне, расшпіліце каўнер кашулі, тугі рэмень ці пояс.

● Дайце пад язык гліцын (шэсць таблетак на працягу гадзіны).

●Памерайце артэрыяльны ціск. Калі ён павышаны, дайце прэпарат, які хворы звычайна прымае ў такіх выпадках (напрыклад, каптапрыл).

● Пры першых прыкметах ірвоты павярніце галаву хворага на бок, каб ірвотныя масы не трапілі ў дыхальныя шляхі.

Існуе міф, што пасля перанесенага інсульту не будзе поўнага аднаўлення. На самай справе гэта залежыць ад многіх фактараў. Па-першае, які быў інсульт — ішэмічны ці гемарагічны. Па-другое, важную ролю адыгрывае памер ачагу пашкоджання ў мозгу: чым большая гэта частка, тым больш цяжкі стан пацыента, аднаўленне ідзе больш складана. Калі гэта ачагі невялікіх памераў і размешчаны ў тых зонах, якія стратэгічна не такія значныя для арганізма, яны могуць цалкам аднавіцца да таго ўзроўню, які быў да захворвання. Мае значэнне і тое, колькі хутка чалавек звярнуўся па дапамогу да медыкаў і якія тэрапеўтычныя мерапрыемствы былі праведзены.

ПЕРШАЯ ПРЫКМЕТА ІНСУЛЬТУ — слабасць у руцэ і назе з аднаго боку. Часам, калі гэта моцна выражаны сімптом, чалавек можа нават упасці. Калі ж слабасць больш у руцэ, напрыклад, то ён можа ўпусціць аловак, кубак і інш. ДРУГАЯ ПРЫКМЕТА — моўныя парушэнні. Калі чалавек не размаўляе ўвогуле або не ўспрымае, што яму кажуць. Таксама ён можа ўсё разумець, выконваць просьбы, але пры гэтым у яго будзе блытаная размова, адчуванне «кашы ў роце». ТРЭЦІ, найбольш часты, СІМПТОМ — гэта перакос твару, калі раптам узнікае асіметрыя твару, апушчаны вугал роту, твар перацягнуты на адзін бок. Калі нешта з пералічанага заўважылі, варта неадкладна выклікаць хуткую дапамогу.

НА ВОСТРЫХ ІКЛАХ І КІПЦЮРАХ

Як засцерагчы сябе і хатняга гадаванца ад шаленства

Штогод у краіне рэгіструецца да 600 выпадкаў шаленства, прычым хварэюць як дзікія, так і хатнія жывёлы. Гэтая асабліва небяспечная інфекцыя перадаецца і чалавеку, а калі своечасова не прыняць мер, вядзе да смерці. Як абараніць сябе і сваіх хатніх гадаванцаў, што рабіць, калі вас пакусаў чужы сабака, і як могуць заразіцца хатнія жывёлы? Пра шаленства мы распыталі ўрача-эпідэміёлага Цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Кастрычніцкага раёна Мінска Тамару КОВЕЛЬ.

— Ад каго можна заразіцца шаленствам?

— Успрымальнасць да шаленства ўсеагульная, захварэць можа кожны, нягледзячы на ўзрост і сацыяльны статус. Крыніцай інфекцыі з'яўляюцца хворыя хатнія, сельскагаспадарчыя і дзікія жывёлы — сабакі, каты, лісіцы, грызуны і іншыя. У пераважнай большасці выпадкаў перадача віруса людзям адбываецца ад хатніх сабак і катоў. А яны ў сваю чаргу заражаюцца пры кантакце з хворымі бадзяжнымі або дзікімі жывёламі, грызунамі.

— Як адбываецца перадача віруса?

— Ён перадаецца ад інфіцыраванай жывёлы чалавеку праз укусы, драпіны і аслінненні. Прычым, здаровая на першы погляд жывёла можа быць ужо заразнай, паколькі вірус шаленства з'яўляецца ў сліне за 10—12 дзён да выражаных клінічных праяў. Інкубацыйны перыяд у чалавека можа доўжыцца ад 10 дзён да некалькіх месяцаў, у некаторых выпадках нават да года. І калі наступае клінічная стадыя, смерць непазбежная.

— І што рабіць, калі падрапаў вулічны кот?

— Калі адбыўся кантакт з бадзяжнай жывёлай або з хатняй, якая не мае даных аб вакцынацыі, варта неадкладна звярнуцца ў найбліжэйшую медыцынскую ўстанову. Там вас накіруюць да спецыяліста, які правядзе некалькі этапаў прафілактыкі. Па-першае, рану старанна прамываюць вадой з мылам, яе краі апрацоўваюць ёднай настойкай і накладваюць стэрыльную павязку. Затым прызначаецца курс прафілактычных прышчэпак, ён складаецца з шасці ін'екцый. Калі жывёла, з якой адбыўся кантакт, мае гаспадара, за ёй устанаўліваюць ветэрынарнае назіранне. Калі праз 10 дзён яна застаецца здаровай, курс прафілактычных прышчэпак пасля трох ін'екцый прыпыняецца. Калі жывёла бадзяжная і за ёй немагчыма ўстанавіць назіранне, то прышчэпкі робяцца ў поўным аб'ёме.



— Як можна засцерагчы ад небяспекі сваіх гадаванцаў?

— Усе сабакі і каты, незалежна ад пароды і прыналежнасці, павінны штогод прышчапляцца ад шаленства. Хатняга сабаку на вуліцы варта трымаць на кароткім павадку і не дапускаць яго кантактавання з бадзяжнымі сародзічамі. Пры першых прыкметах неўласцівых паводзін жывёлу варта паказаць ветэрынарнаму ўрачу. Пра ўсіх дзікіх жывёл, якія зайшлі ў населеныя пункты, трэба тэрмінова паведамляць у ветэрынарную службу. Пры знаходжанні трупаў жывёл не трэба знімаць з іх скуру. Калі кантакт з падазронай жывёлай усё ж адбыўся, неадкладна звяртайцеся па медыцынскую дапамогу.

Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ ОБ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ПЯТОГО ВЫПУСКА ОБЩЕСТВА С ОГРАНИЧЕННОЙ ОТВЕТСТВЕННОСТЬЮ «СтройИнфоКонсалт»
ТАВАРЫСТВА З АБМЕЖАВАНАЙ АДКАЗНАСЦЮ «БудІнфаКансалт»

1. Полное наименование:
на русском языке – общество с ограниченной ответственностью «СтройИнфоКонсалт»;
на белорусском языке – таварыства з абмежаванай адказнасцю «БудІнфаКансалт».
Сокращенное наименование:
на русском языке – ООО «СтройИнфоКонсалт»;
на белорусском языке – ТАА «БудІнфаКансалт».

2. Общество с ограниченной ответственностью «СтройИнфоКонсалт» (далее по тексту – Эмитент) было зарегистрировано решением Мингорисполкома от 11 января 2010 года в ЕГР за № 191162346.

Место нахождения Эмитента: Республика Беларусь, 223021, Минская область, Минский район, Щомыслицкий с/совет, аг. Озерцо, ул. Звездная, д. 21, помещение 11. E-mail: iinna68@mail.ru, www.dom-ozertso.by. Тел./факс (+37517) 512 52 81.

3. Основным видом деятельности Эмитента является реализация проектов, связанных со строительством зданий.

4. Сумма зарегистрированного уставного фонда Эмитента составляет 120,00 (сто двадцать) белорусских рублей 00 копеек.

5. Общий объем пятого выпуска жилищных облигаций Эмитента составляет 1 020 000,00 белорусских рублей. Количество эмитируемых облигаций составляет 600 штук. Номинальная стоимость жилищной облигации пятого выпуска составляет 1700,00 белорусских рублей и имеет эквивалент номинальной стоимости равный одному метру квадратному общей площади жилого помещения в строящемся жилом доме № 5 в составе объекта «Многоэтажные жилые дома в д. Озерцо Щомыслицкого сельсовета. Корректировка», 8-я очередь строительства.

6. Исполнение обязательств Эмитента по погашению размещенных жилищных облигаций пятого выпуска обеспечивается страхованием ответственности за неисполнение (ненадлежащее исполнение) обязательств Эмитента облигаций на основании договора, заключенного Эмитентом с БРУСП «Белгосстрах» и с СООО «Белкоопстрах» (договор № 005087-18/3137 добровольного страхования ответственности за неисполнение (ненадлежащее исполнение) обязательств Эмитента облигаций от 29 ноября 2018 года). Указанное обеспечение действует в течение всего срока обращения жилищных облигаций, а так же в течение трех месяцев после окончания срока обращения жилищных облигаций.

7. Номер счета Эмитента на который будут зачисляться средства, поступающие при размещении жилищных облигаций: текущий счет № BY81BAPB30122497500170000000 в Региональной дирекции по г. Минску ОАО «Белагропромбанк» БИК BAPBBY2X.

9. Депозитарное обслуживание Эмитента осуществляет депозитарий – Республиканское унитарное предприятие «Республиканский центральный депозитарий ценных бумаг».

Юридический и почтовый адрес депозитария Эмитента: 220004, г. Минск, ул. Мельникайте 2, 4-й этаж;

Дата и регистрационный номер депозитария Эмитента как юридического лица, наименование регистрирующего органа: Мингорисполком, № 100967318 от 6 марта 2003 года; номер специального разрешения (лицензии) № 02200/5200-4-1111 на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, выданное Министерством финансов Республики Беларусь.

10. С более подробной информацией и с проспектом эмиссии жилищных облигаций можно ознакомиться в открытом акционерном обществе «Интертраст групп» по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, д. 28А, комн. 513.

Директор И. В. Иванская

Главный бухгалтер А. А. Карпеко

РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «АВТО ОТ МАСТЕРКАРД. ДЕКАБРЬ»

Организатор рекламной игры: ЗАО «Сэлмон-Графикс».

Юридический адрес: 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 11, ком. 43, УНП 100843219, зарегистрировано решением Минского горисполкома от 2 декабря 2008 г.

Рекламная игра называется «Авто от Мастеркард. Декабрь».

Срок проведения рекламной игры: в период с 1 декабря по 28 января 2019 года (включая периоды розыгрышей и вручения призов).

Территория проведения рекламной игры: автозаправочные станции предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в состав Государственного производственного объединения «Белоруснефть», находящихся в Республике Беларусь.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3425 выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 15 ноября 2018 г.

В рекламной игре приняло участие 111 604 физических лица.

Призовой фонд разыгран полностью.

Победитель рекламной игры «Авто от Мастеркард. Декабрь»:

Главный приз № 1 – Автомобиль: KIA RIO_FB, № кузова Z94C241AAKR095353 и денежные средства для уплаты налога в размере 3 851,89 белорусского рубля

№ п/п	№ Шанса	Номер карты	ФИО победителя	Населенный пункт
1	003214	2000000387710	Белый Юрий Геннадьевич	Речица

Телефон горячей линии по вопросам проведения рекламной игры: (МТС – 033, Velcom – 029, Life – 025) 6 431 431, круглосуточно

РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторных электронных торгов со снижением цены по продаже квартиры, принадлежащей ОАО «БМЗ-управляющая компания холдинга «БМК»

Лот №170119001. Трехкомнатная квартира с кадастровым (или условным номером) 77:07:0001002:22536. Г. п. – 1986. Общая площадь – 75,3 кв. м. Этаж – 3. **Местоположение лота: Российская Федерация, г. Москва, ул. Осенняя, д. 22, кв. 12. Начальная цена (без учета НДС), рос. руб. – 9 128 877,65. Задаток, рос. руб. – 460 000,00. Шаг электронных торгов – 5 %**

Размер штрафа, в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12 июля 2013 г. № 608, составляет 2 000,00 белорусских рублей

Дата и время начала проведения электронных торгов 18.02.2019 в 10.00 (по времени на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»)

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом ЭТП «ТОРГИБЕЛ» с соблюдением требований, утвержденных постановлением Совета Министров РБ № 608 от 12 июля 2013 г. Условия электронных торгов содержатся на сайте Организатора электронных торгов ino.by и на ЭТП «ТОРГИБЕЛ». **Продавец:** ОАО «БМЗ – управляющая компания холдинга «БМК» 247210, Гомельская обл., г. Жлобин, ул. Промышленная, 37, тел. 8 (02334) 5-45-20, факс. 8 (02334) 3-10-70.

Организатор электронных торгов и оператор электронной торговой площадки: РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, тел. 8 (017) 306-00-57. **Электронный адрес ЭТП:** http://торги.бел.

Задаток в российский рублях перечисляется на р/с BY57BLBB30120190055182001006 в ОАО «Белинвестбанк», BIC банка BLBBBY2X, г. Минск, пр-т Машерова, 29, не позже срока окончания приема документов на участие в электронных торгах. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в электронных торгах по продаже квартиры, принадлежащей ОАО «БМЗ-управляющая компания холдинга «БМК» (лот № **170119001**), проводимых 18.02.2019. Аккредитация, регистрация и участие в электронных торгах осуществляется на ЭТП «ТОРГИБЕЛ». **Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами**: 13.02.2019 в 11.00. Все желающие могут предварительно ознакомиться с Предметом электронных торгов. Контактное лицо для осмотра – Бондаренко Владимир, тел. +74956496537 доб. 200. Детальная информация о порядке участия в электронных торгах размещена на сайте ЭТП «ТОРГИБЕЛ» (http://торги.бел). Первое, полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 14.12.2018

Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: tb@ino.by

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 441/С-15061 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина) общей площадью 507,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Ивье, ул. Карла Маркса, 16

Лот № 1 расположен на земельном участке кадастровый № 422950100001002709 площадью 0,0743 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли (для обслуживания здания магазина «Ритуалы»), расположенном по адресу: г. Ивье, ул. Карла Маркса, 16

Начальная цена продажи – 25 560 руб. (двадцать пять тысяч пятьсот шестьдесят рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 1 278 руб. (одна тысяча двести семьдесят восемь рублей)

Продавец – Ивьевский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231337, Гродненская область, г. Ивье, ул. Энгельса, 5, тел. 2-11-67, факс 2-23-95

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона

Расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возложить на Покупателя.

Право собственности переходит к Покупателю после передачи объекта и государственной регистрации данного права в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

Документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи.

Расходы, связанные с проведением аукциона (в том числе по уплате вознаграждения Организатору торгов в размере 5 % от конечной цены продажи), подготовкой документации, необходимой для его проведения, и публикации извещения в средствах массовой информации и размещения на официальном сайте, возмещаются Победителем аукциона Ивьевскому филиалу Гродненского областного потребительского общества.

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 5 февраля 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем, организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 11.04.2018 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 30 января 2019 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ИООО «ПЕРФЕКТПЛАСТ»

Предметы торгов

Лот № 1

1) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-82194 площадью 554 кв. м (назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: склад (2-я очередь 1 этап), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001020631 площадью 0,8641 га, по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Коммерческая, 28Г;

2) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-57695 площадью 38,2 кв. м (назначение: здание неустановленного назначения; наименование: КПП), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001020631 площадью 0,8641 га, по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Коммерческая, 28Г/1, КПП

Начальная цена, руб. (без учета НДС)	209 900,00	Задаток, руб.	20 990,00

Лот № 2

Ворота металлические, инвентарный номер 0028; ворота распашные, инвентарный номер 0045; ворота распашные, инвентарный номер 0046; ограждение металлическое, инвентарный номер 0029

Начальная цена, руб. (без учета НДС)	7 366,56	Задаток, руб.	736,66

Условия продажи	Без условий
Организатор торгов	Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона
Условия оплаты	В соответствии с заключенным договором купли-продажи
Номер р/с для перечисления задатка	BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк». Региональная дирекция № 100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245

Аукцион состоится 27 февраля 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционных торгах, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 26 февраля 2019 г. до 17.00

*** Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает затраты на организацию и проведение аукциона**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже права заключения договора аренды земельного участка

Организатор аукциона: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-14.

Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды, размер начальной цены и задатка

Лот № 1. Право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым № 225580411901000146, расположенного по адресу: Витебская обл., Шарковщинский р-н, Бильдюгский с/с, аг. Новоселье, ул. Полевая, площадью 0,0663 га, сроком на 25 лет для строительства торгового павильона (целевое назначение: земельный участок для размещения объектов розничной торговли). Земельный участок имеет ограничения прав в использовании земель: водоохранная зона реки, водоема (р. Густатка), придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильной дороги. **Нач. цена:** 190,80 бел. руб. **Задаток:** 19,08 бел. руб.

Дата, время и место проведения аукциона: 25.02.2019 в 14.15, г. п. Шарковщина, ул. Комсомольская, 15, в Шарковщинском райисполкоме. Срок внесения задатка и подачи документов: с 23.01.2019 по 22.02.2019. Время работы с 8:30 до 17.30 (обед:13:00-14:00). **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY81AKBB36003300040000000000 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 4002. Получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области. Для участия в аукционе приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели, юридические лица, консолидированные участники (двое и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юридических лиц)

Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола аукциона: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка или часть платы в случае предоставления рассрочки ее внесения; возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участниками документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка, в т.ч. с гос. регистрацией создания этого участка; возместить в установленном порядке потери сельскохозяйственного производства в сумме 2299,87 бел. руб. на транзитный счет Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Витебской области открытой для районной инспекции Министерства по налогам и сборам Республики Беларусь по месту постановки на учет плательщика на раздел 52, подраздел 01 (код платежа 05201) на р/с BY97AKBB36029130100020000000, БИК AKBBBY2X, УНП 301322012, связанные с изъятием 0,0663 га сельскохозяйственных земель для нужд, не связанных с ведением сельского хозяйства; после выполнения указанных действий заключить с Шарковщинским райисполкомом договор аренды земельного участка; осуществить в течение 2 месяцев со дня подписания договора аренды государственную регистрацию прав на земельный участок в Шарковщинском бюро Глубокского филиала РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; срок действия права аренды на земельный участок оканчивается по истечении 25 лет с момента гос. регистрации создания земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него. За три месяца до окончания срока аренды на земельный участок, совместно с Шарковщинским райисполкомом, в установленном порядке решить вопрос его дальнейшего использования; получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение Шарковщинского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ, разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 1 год; приступить к занятию земельного участка (начать строительство) в соответствии с целью и условиями его предоставления в течение 6 месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектно-сметной документации; снять на занимаемом участке плодородный слой почвы и использовать его согласно проектной документацией; завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией. Для участия в аукционе граждане, индивидуальные предприниматели, консолидированные участники и юр. лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок подают заявление на участие в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/с, с отметкой банка, заключают соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем иностранного юр. лица – легализованные копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык, легализованные доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; консолидированными участниками представляются оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов предъявляется документ, удостоверяющий личность. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Контактные тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by

Вниманию акционеров ОАО «Элема» (г. Минск, ул. Тростенецкая, 5)!

Наблюдательный совет ОАО «Элема» доводит до сведения акционеров, что 31.01.2019 г. состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Элема».

– место проведения собрания – г. Минск, ул. Тростенецкая, 5А, Дом культуры ОАО «Элема»;

– время начала собрания – 15.00;

– время и место регистрации участников собрания: в день проведения собрания с 14.00 до 14.50 по адресу г. Минск, ул. Тростенецкая, 5А, Дом культуры ОАО «Элема»;

– время и место ознакомления акционеров с документами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни (понедельник-пятница), начиная с 23.01.2019 г. по 30.01.2019 г., по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 5А, Дом культуры ОАО «Элема» с 9.00 до 15.00; 31.01.2019 г. – по месту проведения собрания с 9.00 до 15.00.

Орган общества, созывающий внеочередное общее собрание акционеров – наблюдательный совет, основание его созыва – собственная инициатива наблюдательного совета.

Повестка дня:

1. О внесении изменений и дополнений в Положение о вознаграждениях и компенсациях, выплачиваемых членам наблюдательного совета ОАО «Элема».

Список лиц, имеющих право на участие в собрании, будет составлен по состоянию на 28.01.2019 г.

Просим принять участие в собрании или поручить представлять Ваши интересы на собрании акционеров представителю. Для участия в собрании акционеру необходимо при себе иметь паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность, оформленную в соответствии с требованиями законодательства, либо иной документ, подтверждающий его полномочия в качестве представителя.

Дополнительная информация по телефонам: +375 17 364 73 09, +375 29 332 72 91

УНП 100074549

Валянцінкай

ЧАКАННЕ ЗІМЫ

...Той вясной між суседзямі толькі і гутаркі было: «Волька замуж ідзе...», «Волька замуж ідзе...». І казалі ж, відаць, за каго? Аднак, сутыкнуўшыся з ёй самой, проста грэх было не спытаць: «Ну, хто ж той шчаслівы?»

Пра яго тады распытвалі, мусіць, многія, і Вольга адказвала — са шчаслівай усмешкай, з ахвотай: і як завуць, і адкуль ён родам, і на колькі старэйшы, і кім працуе...

Не здзівіла яе і пытанне, дзе маладая сям'я будзе жыць. «У нас, дома», — адказала спакойна. — Месца ж хапае. Бацькі ў адным пакоі, мы ў другім...». — «Але ж нешта плануеце — будаваць сабе ці купіць?» — «Не, ну што вы, — адхрысцілася раптам Воля, — гэта сёння так дорага ды і навошта? Бацькі ж некалі памруць»...

Даўно адбылася гэта размова, даўно запісалася-надрукавалася і, шчыра кажучы, відаць, забылася б, але...

Класік праўду пісаў: «Нам не дано предугадать, как наше слово отзовется...» Гадоў праз колькі адна з жанчын расказала, як, прачытаўшы гэты дыялог, не на жарт спужалася, бо разам з ёй у трохпакаёвай кватэры жылі два амаль дарослыя ўжо сыны. То-бок, не сёння, дык заўтра, і не адзін, дык другі (а то і абодва...) ажэняцца. Прычым малаверагодна, што знойдуць жонак з кватэрамі, што пойдуць некуды ў прымы ці на прыватныя... Хутчэй за ўсё прывядуць нявестку ці нявестак дадому, да сябе (дакладней — да яе). І ўжо яны, тыя нявесткі, як вось гэтая дачка (!), як Волечка, хоць-нехаць ды будуць чакаць, што маці «некалі ж памрэ»...

З гэтым трэ было нешта рабіць. А вось што? Нешта купляць ці будаваць самой? З двума едакамі ў хаце? На яе невялікую зарплату? Гэта проста нерэальна, як той казаў! А тым больш у Мінску... Нешта прадаць? Не смяшыце мае пантофлі! Дацягнуць да пенсіі, а потым з'ехаць дамоў, у вёску да мамы (дай бог ёй здароўя!), — таксама не выйсце, бо што яны там распачнуць — удзвюх, можна сказаць, без мужчын і ў старэнькай хаце з выгодамі на вуліцы?

Думкі круціліся ў галаве і так, і вось гэтак. «Можа, — пытала яна сама ў сябе, — сесці на нішчымніцу — пачаць эканоміць на ежы, адзенні, адпачынку, бензіне?

І што на гэтым выйграеш? А што прайграеш?..

Можа, пашукаць сабе іншую работу — з большым заробкам? Але ж паспрабуй знайдзі яе без славутага блату... Ды і нагрузка там будзе, відаць, не меншая. Ці пацягне яна, ці справіцца, бо трэба ж дзяцей глядзець, хоць ужо і не маленькіх, трэба дом у парадку трымаць і ў выхадныя — гэта святое — ездзіць у вёску (добра, што машына ёсць) да старэючай мамы — там заўжды работы не мерана...»

З усіх ці не сто разоў пракручаных варыянтаў больш-менш прымальным заставаўся хіба адзін: пакуль працуе і мае здароўе, шукаць запасны аэрадром (то-бок жытло для сябе) не ў сталіцы з яе шалёнымі цэнамі, нават не ў прыгарадзе, а як бы наводшыбе...

Праўду кажуць, хто пытае, той не блудзіць, хто шукае — знойдзе. У прыгожым мястэчку (юрыдычна — аграгарадку), за дзевяноста кіламетраў ад Мінска (але па добрай дарозе) прадавалася трохпакаёўка з усімі выгодамі, з так званым еўрапейскім рамонтам і нават часткова з мэбляй у кухні і спальні.

Прасілі за ўсё пра ўсё, вядома ж, нямала, але — ці пан ці прапаў — жанчына купіла.

Не без таго — ёй прыйшлося ўлезці ў даўгі і ўзяць крэдыт; каб аддаваць іх ды пагашаць, — знайсці падпрацоўку (і нават не адну). Падштурхнуць да заробкаў сыноў, «сесці» на рэжым эканоміі...

Але ж справа была таго вартая! Карацей, «запасны аэрадром» (месца, дзе яна будзе жыць — потым, калі «дзеці» пажэняцца, а яна выйдзе на пенсію) у сям'і з'явіўся! Больш за тое... запрацаваў, бо ў тое мястэчка (райскі куточак: пад вокнамі — рэчка, навокал лес) на пяць-шэсць цёплых месяцаў з ахвотай «злятаюцца» кватаранты-адпачывальнікі. А на зіму з вёскі туды едзе матуля і жыве — як тая пані, бо ў хаце чысценька, цёпленька, утульненька, бо «вада гарачая са сценкі цячэ» (гэта яна так кажа). І ні табе дровы насіць ды ў печы паліць, ні снег разграбаць, ні аўталаўку чакаць на вуліцы, ні ў лазню хадзіць у другі канец вёскі... «Я ніколі так не жыла», — кажа маці дачцэ.

А нядаўна і наогул выдала: «Каб не гэта кватэра, — сказала ёй, — то чаго б мне чакаць? Толькі смерці. І я б ужо дачакалася... Цяпер жа — няма калі: зімой чакаю лета, каб паехаць дамоў у вёску, а летам чакаю зімы».

...Вось так. І хто казаў, што не трэба слухаць людзей, не трэба запісваць іх размовы і чытаць?!

Яшчэ і як трэба!

Валянціна ДОЎНАР.

P.S. Не так даўно ў агульных знаёмых распытала, як жыве тая Волечка?

І пачула, што ў хуткім часе пасля вяселля ў яе нарадзіўся хлопчык, што парадавацца ўнуку дзед, можна сказаць, не паспеў — памёр (у пяцьдзясят з невялічкім, раптоўна), а вось бабуля — пакуль жыве, хоць і злоўжывае, як той казаў, бо з першых дзён не ладзіць з зяцем, а цяпер ужо і з дачкой.

Недаступная сняжынка,
Я за ёй — яна далей,
Ад галінкі да ялінкі
Усцяж аснежаных алей.
Ні у полі, ні у лесе
За яе няма мілей.
За сняжынкаю-гарэзай
Сочыць бацька зімавей.
Абагрэў бы яе ласкай,
Ды пяшчотаю сваёй...
Але чую — знікне казка,
Як зімовы снег вясной.

Радзіннае

Як ратавацца ад «благіх вачэй»?

«Нарадзілася дзіця, запрасілі на хрэсьбіны сваякоў, суседзяў, пацешыліся на малое, пасядзелі за сталом. Госці пайшлі, а немаўля ўсю ноч не спала, плакала. Бабуля перажывала: «Сурочылі дзіця». Ці сапраўды так могуць паўплываць «благія вочы»? І як дапамагчы дзіцяці ў такім выпадку?» — чытаем мы ў некалькіх допісах падобныя адно на адно пытанні.

Менавіта вочы з'яўляюцца адным з інтэнсіўных каналаў энергетычнага абмену з навакольным светам, які мае двухбаковую скіраванасць: навакольны свет праз вочы ўздзейнічае на свядомасць чалавека і адначасова чалавек можа актыўна ўздзейнічаць на навакольны свет. Паводле народных уяўленняў, чалавек мог адным толькі поглядам паўплываць на лёс іншага чалавека, «адняць» здароўе, зрабіць непрацаздольным на нейкі час і г. д. Пра некаторых людзей казалі, што ад іх погляду ўсё вакол «камянее». У народнай медыцыне такое ўздзеянне завуць сурокамі (урокі, прызоры, *руск*. сглаз).

Пры сустрэчы з чалавекам, які быў вядомы як зайздросны, злы, імкнуліся абавязкова «абараніць» сябе славесным абярэгам: «Ліхое вока, не глядзі на нас!»; «Чорнае вока, карае вока, памілуй нас!» або малітвай. Акрамя таго раілі ў думках акрэсліць вакол сябе кола і сказаць: «Вакол мяне кола, малявала яго не я, а Багародзіца мая». Ці, зноў жа ў думках уявіць, што знаходзішся побач з вогнішчам, якое павінна стаць мяжой-сцяной паміж вамі і вашымі нядобразычліўцамі. Такой сцяной можа быць люстэрка, якое вы ў думках трымаеце ў руках люстраной паверхняй ад сябе, нібы пускаючы «сонечных» зайчыкаў.

У народзе існаваў шэраг магічных дзеянняў, якія трэба было выканаць перад сустрэчай з такім чалавекам (надзець бялізну навыварат, завязаць вузлы на поясе, узяць з сабой амулет) ці адразу ж пасля яе (паказаць кукіш, сплюнуць праз левае плячо) і інш.

Часцей за ўсё ад сурокаў пакутуюць людзі, якія знаходзяцца ў так званым пераходным становішчы: дзеці да саракавога дня, таму што яны яшчэ не маюць анёла-ахоўніка, цяжарныя жанчыны і парадзіхі, маладыя на вяселлі. Адным з абярэгаў немаўляці ад сурокаў служыла тое, што да хрышчэння нікому не расказвалі яго сапраўднага імя, а таксама было забаронена хваліць дзіця, казаць, якое яно здаровае, прыгожае, румянае і г. д., бо лічылі, што такімі дзеяннямі можна ўгнявіць Нябесныя сілы, і дзіця захварэе. На вяселлі ахоўваць нявесту ад магчымых сурокаў, наступствы якіх для здароўя яе самой і асабліва будучых дзяцей маглі быць самымі непрадказальнымі, павінны былі вянок і вэлюм.

Народныя лекары ведалі шмат спосабаў «лячэння» сурокаў. Адзін з такіх спосабаў — загавораная вада. Раніцай бралі «непачатую» (г. зн. нікім не пітую) крынічную або вадохрышчанскую ваду, клалі ў яе тры вугольчыкі з печы, пажадана ад спальвання бярозавага палена, сыпалі тры драбкі чацвярговай солі, чыталі малітву, замову і абціралі (апырсквалі) хворага, давалі піць. У фундаментальным акадэмічным томе «Замовы» (укладальнік Г. А. Барташэвіч) серыі «Беларуская народная творчасць» можна знайсці вось такую народную замову: «Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Божай маці пакланюся. Прачыстая Божая мацер з прастола ўставала, раба Божага (імя) балезнь шаптала. Раб Божы (імя) на свет нарадзіўся, сонейкам асвяціўся, месяцам абгарадзіўся, святымі абараніўся. Як стаў за стол святых саджаці, то ад яго стала боль адступаці. Стаў святых мёдам і віном частаваці, балезнь пабегла з хаты ўцякаці. Як з таго свету не ўставаці, так рабу (імя) балезнь не знаці». Пасля такіх дзеянняў хворага прасілі абцерціся сваёй (або маці, сястры, жонкі) ніжняй кашуляй, падолам спадніцы, але абавязкова левым бокам.

Ад сурокаў бераглі не толькі людзей, але і свойскую жывёлу, больш за ўсё карову — галоўную карміцельку. «Чужыя» вочы не павінны былі бачыць, калі карова доіцца або целіцца, каб «не знікла» малако, не «прыцягнуць» хваробы.

З той жа прычыны чужых людзей не пускалі на грады падчас пасеву або пасадкі: «Чужое вока — што хвацкі вораг, зайздросна, а зайздрасць — што іржа: увесь ураджай поедам есць!» Перад тым, як пачаць сеяць агарод, гаспадар раніцай, каб ніхто не бачыў, кідаў у калодзеж адну-дзве манеты: і для добрага ўраджаю, і каб засцерагчыся ад дурнога вока. Яшчэ адна добрая парада: нашы бабулі не пачыналі саджаць або сеяць ад плота (агароджы, мяжы), лепш каб «першай» была градка бліжэй да хаты.

Аксана КАТОВІЧ,
Янка КРУК.

Дасылайце свае пытанні аб каранях і прыстасаванасці да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый і абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».

МІЛЬЁНЫ НА ПЛЯЧАХ

Нарэшце зіма патроху ўспамінае пра тое, што яна зіма, і ўсё часцей радуе нас тым, што ў гэтай пары года павінна быць абавязкова, а менавіта маразамі. Пры тэмпературы ніжэй 15—20 °С у справу ўступае жаночае футра — асаблівы прадмет гардэробу. Не ўсім, вядома, даступная гэтая прыгажосць, а што датычыцца найлепшых яе экзэмпляраў, то яны па кішэні толькі вельмі заможным грамадзянам. Як нішто іншае, футра паказвае густ і статус сваёй гаспадыні, таму модныя дамы і зоркі шоубізнесу, спорту і «звычайныя» багацеі нязменна спаборнічаюць паміж сабой, імкнучыся стварыць або набыць футра, якое будзе здзіўляць як сваёй прыгажосцю, так і коштам.

Прадстаўляем вам пяць самых дарагіх і незвычайных футраў у свеце. Вядома, гэта далёка не поўная падборка дарагіх і стыльных вырабаў такога кшталту. Амаль у кожнай знакамітасці — галівудскай, еўрапейскай, нашай — ёсць свой футра-гардэроб, а яго кошт часта перавышае ўсе разумныя (для звычайных людзей) межы.

На **першым месцы —** шуба ад Карла Лагерфельда, дызайнера Chanel і Fendi. Гэты імпазантны 85-гадовы мадэльер заўсёды славіўся ашаламляльнымі калекцыямі. Нават у сваім шаноўным узросце Карл не страчвае натхнення. Адно з яго дзіўных тварэнняў — шуба за 1 мільён еўра, прадэманстраваная на паказе Fendi. Гэта, без сумневу, самая дарагая шуба ў свеце.

Для таго каб увасобіць у жыццё гэты цуд дызайнерскай думкі, спатрэбілася 60 скурак собаля — аднаго з самых каштоўных і дарагіх футраў. Баргузінскі собаль — эксклюзіўны, футра ў яго насычана-цёмнае, з ноткай сівізны і трохі блакітнаватым адценнем. Менавіта яго і выбраў Лагерфельд для сваёй задумкі. Шуба, і праўда, выглядае цудоўна. Футра апрацавалі адмысловым спосабам, каб здавалася, быццам яго асвятляе святло месяца. Боская прыгажосць і недасяжны кошт — у гэтым увесь Лагерфельд.

На **другім месцы —** італьянскі дом моды Loro Piana са сваімі вырабамі з футра вікуні. Вікунья — жывёла з пароды лам, якая водзіцца толькі ў Перу. Гэта прадмет нацыянальнага гонару краіны, таму іх адлоў строга рэгламентаваны і абмежаваны. Знайсці паўнавартаснае футра з вікуні ўжо амаль немагчыма, італьянцы ў асноўным робяць паліто і жакеты з воўны гэтай жывёлы. Loro Piana — адна з нешматлікіх кампаній, якая мае легальны дазвол на вытворчасць менавіта шуб з вікуні.

Мех у гэтай сваячкі ламы густы, мяккі і прыгожы, але на дзіва тонкі. У старажытныя часы насіць адзенне з такога футра і воўны маглі толькі прывілеяваныя інкі, людзі з «чыстай крывёй Сонца». Усе астатнія не смелі дакранацца да вікуні пад страхам смерці.

Сёння, каб купіць кажушок з гэтага футра, ужо не патрэбныя доказы высакароднага паходжання. Хіба што фінансавага становішча. Задавальненне гэта нятаннае, адзін метр тканіны з вікуні можа каштаваць больш за 5 тысяч еўра, а цана гатовага жакета з воўны ад Loro Piana пачынаецца ад 15 тысяч еўра. Калі ж вам пашчасціць знайсці шубу з суцэльнага футра вікуні (іх у свеце зусім мала), то яе кошт дакладна будзе казачным — каля 300 тысяч еўра.

На **трэцім месцы** актрыса Шэран Стоўн, якая любіць натуральныя шубы і кожны раз паказваецца на публіцы ў новым уборы. Нават на Канскім кінафестывалі, у спякоту, Шэран абавязкова з'яўляецца ў паўшубку з каштоўнага футра. Але асабліва кіназорка здзівіла сваіх прыхільнікаў уборам з футра лісіцы. Гэта шыкоўная доўгая накідка, у якой Шэран з'явілася на адным з дабрачынных мерапрыемстваў супраць СНІДу ў Рыме. Для таго каб пашыць такі выраб, спатрэбілася 40 лісіных скурак. На думку спецыялістаў, доўгая футравая накідка абышлася ўладальніцы прыкладна ў 200 тысяч долараў.

Самыя дарагія футры ў свеце

На **чацвёртым месцы** самых дарагіх шуб расійская спявачка Алсу са сваім кажушком, кошт якога, па чутках, складае 100 тысяч долараў. Шыкоўную абноўку з футра шыншылы вядомая спявачка атрымала ад мужа Яна Абрамава на чарговы дзень нараджэння.

Шыншыла цэніцца за цікавую расфарбоўку. Прырода падарыла ёй дзіўнае футра, яно вельмі лёгкае і пераліваецца некалькімі адценнямі адначасова. З адной валасяной цыбуліны расце да 80 найтанчэйшых валасінак футра, таму яно выглядае такім пухнатым. Асабліва прыгожа шубы з шыншылы глядзяцца на выгібах, дзе футра блішчыць і пераліваецца. Алсу любіць рэдкія футры, і ў сваёй дарагой абноўцы таксама выглядае раскошна.

Завяршае нашу падборку на **пятым месцы** Мэрылін Манро, вядомы знаток футраў. У гардэробе гэтай актрысы і спявачкі было мноства шуб і паўкажушкоў з пясца, норкі, куніцы, лісы.

Але асаблівым хітом стаў паланцін з гарнастая, які яна надзявала перад візітам на дзень нараджэння Джона Кенэдзі. Гарнастай — адзін з найкаштоўнейшых і рэдкіх футраў, здаўна ім падбівалі каралеўскія мантыі. Яго мяккае і трывалае футра з ідэальнай белізной упрыгожвала ўборы самых заможных людзей. Футра гарнастая сімвалізуе высакароднасць і чысціню намераў. Беласнежны паланцін Манро, дарэчы, стаў сапраўдным хітом моды таго часу, і яшчэ некалькі гадоў яго спрабавалі капіраваць. Шмат гадоў паланцін Манро ляжаў без справы і зусім нядаўна быў прададзены з аўкцыёну за 69 тысяч долараў.

Дайджэст

Каб пазбегнуць глабальнай катастрофы, трэба есці менш мяса і цукру?

У Лонданскім універсітэце прыйшлі да высновы, што людзі павінны змяніць свой рацыён харчавання і метады вытворчасці ежы, каб пазбегнуць катастрафічных наступстваў для Зямлі і заўчаснай смерці мільёнаў чалавек.

На думку навукоўцаў, чалавецтва павінна спажываць удвая менш чырвонага мяса і цукру, а таксама есці ў два разы больш гародніны, садавіны і арэхаў. Цяпер галадаюць амаль мільярд чалавек, а яшчэ два мільярды харчуюцца няправільна, што павялічвае захворванні на рак, атлусценне, дыябет і стварае шматлікія парушэнні ў сардэчна-сасудзістай сістэме. Штогод з-за хвароб, звязаных з нездаровай дыетай, паміраюць да 11 мільёнаў чалавек.

Англійскія навукоўцы лічаць, што пракарміць 10 мільярдаў чалавек у 2050 годзе, а таксама знізіць негатыўнае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе можна толькі з дапамогай радыкальных змяненняў у харчовай сістэме. Так, на іх думку, кожны чалавек не павінен ужываць больш за 14 грамаў чырвонага мяса і больш за 250 грамаў малочных прадуктаў штодзень. Даследчыкі пішуць, што гэта зменшыць выкіды метану ў атмасферу, а таксама скароціць плошчы высечкі лясоў пад пашы.

Аднак у снежні ў СМІ прайшлі публікацыі, у якіх іншыя навукоўцы лічаць, што пераход на вегетарыянскую дыету і адмова ад мяса не толькі не паменшыць негатыўнае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе, але нават узмоцніць яго за кошт распаўсюджвання сельскагаспадарчых угоддзяў.

Адзенне, якое сочыць за школьнікамі

Сучасныя тэхналогіі ўсё часцей выкарыстоўваюцца не толькі ў звыклых ужо аргтэхніцы, мабільных прыладах і бытавой тэхніцы, але і ў такіх, здавалася б, за тысячагоддзі нязменных рэчах, як вопратка.

Кітайскія школы ўжо зараз адсочваюць месцазнаходжанне вучняў праз абсталяваную чыпамі «разумную форму». У кожным камплекце адзення — па два чыпы, якія размяшчаюцца на плячах. Менавіта яны і дазваляюць даведацца, калі вучань уваходзіць у школу або выходзіць з яе. Акрамя таго, выкарыстоўваецца таксама элемент тэхналогіі распазнавання твараў, які вызначае, ці сваю форму апрануў школьнік. Калі вучань пажадае пакінуць школу ў навучальныя гадзіны, то прагучыць сігнал. Як адзначае кампанія Guizhou Guanyu Technology Company, якая распрацавала гэтую разумную тэхналогію, форму можна мыць: яна здольная вытрымаць тэмпературу да 150 градусаў Цэльсія і да 500 выпрабаванняў у пральнай машыне.

Прадугледжаны ў разумнай вопратцы і дадатковыя функцыі. Чыпы дазваляюць вызначыць, ці не заснуў вучань на ўроку. Прадугледжана таксама магчымасць ажыццяўлення школьнікамі плацяжоў з выкарыстаннем дадатковага пацвярджэння па распазнаванні твару ці адбіткаў пальцаў. Такая форма ўжо выкарыстоўваецца ў дзесяці школах кітайскай правінцыі Гуйчжоў. Як адзначае дырэктар адной са школ горада Рэнхуай, больш за 800 навучэнцаў школы, якую ён узначальвае, носяць гэтую «разумную» форму з 2016 года.

Наименование Рекламной игры: «Наполни праздник вкусом!» (далее – Рекламная игра).
Организатор Рекламной игры: производственное унитарное предприятие «Кока-Кола Бевриджиз Белоруссия» (зарегистрированное 17 марта 2014 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100373962; УНП 100373962).
Местонахождение Организатора Рекламной игры: 223056, Республика Беларусь, Минский район, д. Колядичи, 147/2.
Сроки проведения Рекламной игры: начало – 15 ноября 2018 г., окончание – 24 января 2019 г.
Рекламная игра «Наполни праздник вкусом!» зарегистрирована в Министерстве антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь, свидетельство № 3399 от 22.10.2018 г.
Территория проведения Рекламной игры: Республика Беларусь.
Призовой фонд Рекламной игры был разыгран не в полном объеме. Неразыгранные призы остаются в распоряжении Организатора Рекламной игры.
В Рекламной игре приняли участие 39 569 участников.
Результаты проведения Рекламной игры «Наполни праздник вкусом!» с указанием полного списка победителей приведены на сайте: http://zviazda.by/be/node/151402.
По вопросам проведения Рекламной игры обращайтесь по телефону +375 (44/29) 547-1000 с 12.00 до 20.00 с 15 ноября 2018 г. по 24 января 2019 г.

ХУТКАМОЎКІ, КАЗКІ, ЛІЧЫЛКІ

У Мінску адбыўся конкурс апавядальнікаў беларускай народнай прозы «Кацігарошак»

«Ехаў Янка цераз ямку — бачыць Янка ў ямцы цуд...» Гэту хуткамоўку я памятаю з дзяцінства. Яна ў маіх успамінах, як своеасаблівы камертон, услед якому ажываюць засвоеныя назаўжды ўзоры роднай мовы.

З раніцы да вечара гучалі хуткамоўкі, казкі, лічылкі ў зале Мінскага цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Ветразь». Адкрыты конкурс апавядальнікаў беларускай народнай прозы «Кацігарошак» меў мэту падтрымаць дзейнасць гурткоў апавядальнага жанру ў этнаграфічна дакладнай форме, пашырыць вопыт укаранення ўзораў народнай прозы ў сучасны адукацыйны працэс.

Дзятва чытала казкі, ажыўляючы сюжэты персанажамі лялечнага тэатра, выступала ў народных строях і ў касцюмах герояў любімых паданняў. Што датычыцца хуткамовак — самы час быў глядзець на секундамеры! Найлепшыя выканаўцы вымаўлялі да пяці слоў за секунду, не губляючы высокай артыстычнасці і выразнасці маўлення. Многія былі ў традыцыйных для сваёй мясцовасці вышыванках, галаўных уборах. Свята беларускай народнай прозы адбылося ў межах адукацыйна-культурнай праграмы «Традыцыйная культура і моладзь» Кастрычніцкага раёна Мінска па праекце Мікалая Козенкі — лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва.

Яўген ПЯСЕЦКІ.

Информационное сообщение о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в аг. Будагово, дер. Осово, дер. Глинище, дер. Жажелка и дер. Белая Лужа Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области

1	Форма проведения аукциона	Открытый
2	Дата, время и место проведения аукциона	**26 февраля 2019 года, в 10.00,** г. Жодино, пер. Молодежный, 3, Жодинский сельисполком, кабинет № 1
3	Продавец и его адрес	Жодинский сельский исполнительный комитет, г. Жодино, пер. Молодежный, 3
4	Земельный участок, его кадастровый номер и адрес	**Лот № 1 –** земельный участок площадью 0,1279 га с кадастровым номером 624881703101000422, по ул. Полевой в аг. Будагово. **Лот № 2 –** земельный участок площадью 0,0884 га с кадастровым номером 624881710301000043, по ул. Профсоюзной в дер. Осово. **Лот № 3** – земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881704101000059, в дер. Глинище. **Лот № 4 –** земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881705601000157, в дер. Жажелка. **Лот № 5** – земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881701601000132, в дер. Белая Лужа
5	Условия продажи	Без изменения целевого назначения
6	Целевое назначение земельного участка	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома
7	Начальная цена продажи	**Лот № 1** – 10 000,00 руб. **Лот № 2** – 3 000,00 руб. **Лот № 3** – 7 000,00 руб. **Лот № 4** – 7 000,00 руб. **Лот № 5** – 5 000,00 руб.
8	Условия проведения аукциона	А) продажа по цене не ниже начальной; Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь; В) наличие не менее двух участников; Г) без права предоставления рассрочки
9	Наличие инженерной инфраструктуры	Лот № 1 (газоснабжение) Лот № 3 (в населенном пункте имеется газоснабжение, водоснабжение) Лот № 5 (на улице имеется водоснабжение)
